# Усе на абарону беларускае Школы!



№ 29 (339) 8 жніўня 2003 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Аднoўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы

# АМОН на ліцэістаў

## Праляскоўскі: так і трэба!
## Ліцэісты: будзем стаяць бясконца!

**Улады кінулі амонаўцаў на школьнікаў, якія адстойваюць сваё права вучыцца па-беларуску. «Гэтыя навучэнцы ў гэтым будынку ў гэтых настаўнікаў» — пад такім дэвізам бацькі ліцэістаў з цалкам беларускамоўнае сярэдняе навучальнае ўстановы сталіцы абараняюць права сваіх дзяцей давучыцца ў Ліцэі. Тым самым яны бароняць права ўсіх дзяцей Беларусі вучыцца на роднай мове ў роднай школе па людзкіх падручніках. Ад часоў панскае Польшчы беларускай мовы не вычышчалі з школаў з такой апантанасьцю. Лукашэнка аказаўся добрым вучнем Пілсудзкага.**

**Новы лукашэнкаўскі ідэоляг Алег Праляскоўскі думаў, што справа зь Ліцэем пройдзе гэтаксама гладка, як закрыцьцё сотняў беларускіх школаў у правінцыі. Пастаўлены ўвесну, ён хутка разабраўся з чарговай порцыяй незалежных газэтаў, што занадта сьмела пісалі аб прэзыдэнцкім бізнэсе, стварыў ідэалягічную вэртыкаль. На чарзе былі свабодныя навучальныя ўстановы. У Беларускі ліцэй, што месяцца насупраць стадыёну «Дынама», прызначылі дырэктарку, якая не размаўляла па-беларуску. Такі цынізм увогуле характэрны для дзеяньняў Праляскоўскага. Аднак ліцэісты, замест таго каб абурана сысьці, згуртаваліся для абароны сваёй альма матэр. Гэтым мужным падлеткам і іх сумленным бацькам патрэбная дапамога грамадзтва. Старонка 4.**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

### Зьмена міністраў

**6 жніўня зьмянілася кіраўніцтва міністэрстваў інфармацыі й адукацыі.** Міністрам інфармацыі, замест **Міхаіла Падгайнага**, які «перайшоў на іншую працу», прызначаны **Ўладзімер Русакевіч** (на фота), былы віцэ-прэм'ер і пасол Беларусі ў Кітаі. **Пятра Брыгадзіна**, які выйшаў у адстаўку, зьмяніў на пасадзе міністра адукацыі **Аляксандар Радзькоў** — былы прарэктар Магілёўскага дзяржаўнага ўнівэрсытэту.



IREX-PROMEDIA

# Справа зьніклых: новы паварот

## Нехта ў Расеі ведае таямніцу

22 лістапада 2000 году старшыня КДБ Беларусі **Ўладзімер Мацкевіч** пастанавіў затрымаць **Зьмітра Паўлічэнку** на 30 сутак. Апроч подпісу старшыні Камітэту пад дакумэнтам стаіць санкцыя намесьніка генэральнага пракурора **Сьнігіра**. Сэнсацыйны дакумэнт апублікаваў «рэспубліканец» **Валеры Фралоў**. Сваё крыніцы інфармацыі ён не раскрывае.

Пра лёс Захаранкі, Ганчара, Красоўскага, Завадзкага гаворацца і пішуць, здымаюць фільмы. Толькі высьветліць гэтыя лёс сьледзтву ніяк не ўдаецца. І кожны новы віток цікавасьці да іх справы прыпадае на абвастрэньне адносінаў беларускага кіраўніцтва з Расеяй.

**Працяг на старонцы 3.**



КАЛЯЖ АРЦЁМА ЛЯВЫ

# Маці–Беларусь вучыла, Растоў–тата корміць

Месяц таму ў Опэры адбыўся канцэрт у гонар закрыцьця 65-га філярманічнага сэзону. Гучала француская музыка ў выкананьні Дзяржаўнага сымфанічнага аркестру на чале з галоўным дырыжорам **Аляксандрам Анісімавым**. У якасьці саліста быў запрошаны вядомы скрыпач, прафэсар Парыскай кансэрваторыі **Аліўе Шарльe**.

Публіка ахвотна скарысталася рэдкай улетку магчымасьцю паслухаць добрую музыку. Нягледзячы на суботні дзень, народ актыўна пытаўся пра лішні квіток.

Апошнім часам менскія аматары акадэмічнае музыкі з прыемнасьцю слухаюць сваіх артыстаў і менш ахвотна — чужынцаў. Кола «сваіх» шырокае. Тут і славутая **Марыя Гулегіна**, якая была салісткай нашай Опэры ўсяго шэсьць гадоў, але захавала беларускае грамадзянства. Гэта й амэрыканскі музыка **Леанід Кузьмін**, які нарадзіўся ў Гомелі, вучыўся ў Менску і, яшчэ калі вучыўся, трапіў у лік найлепшых піяністаў сьвету. Гэта й **Генадзь Праватораў** — цяпер народны артыст Расеі.

**Працяг на старонках 11, 12.**

### Колькі каштаваў прыезд расейскіх журналістаў?

Калькуляцыя — старонка 16.

# Прадстаўнік ураду пра адносіны з «Газпромам»

**«Для нас газ — 80% усіх энэргарэсурсаў. Прадаць кантрольны пакет «Белтрансгазу» — тое самае, што прадаць кантрольны пакет дзяржавы», — так патлумачыў пазыцыю беларускіх уладаў у канфлікце з «Газпромам» Валянцін Мацкевіч, намесьнік начальніка ўпраўленьня інвэстыцыяў Міністэрства энэргетыкі.**


АРЦЁМ ЛЯВА

«Няма сэнсу прыватызаваць ААТ «Белтрансгаз» на расейскіх умовах, — кажа В.Мацкевіч. — Нашы ўмовы ўзважаныя і акуратныя. Прадаваць «Белтрансгаз» па балянсавым кошце няма сэнсу. Тым больш што прадпрыемства дае нармальны прыбытак. Любы нацыянальны ўрад высоўваў бы менавіта такія ўмовы, якія Беларусь прапанавала ААТ «Газпром».

В.Мацкевіч лічыць, што пагрозы «Газпрому» транспартаваць газ у абыход Беларусі ці падвысіць цану на яго да сусьветнай не вытрымліваюць крытыкі. «Наўрад ці можна паставіць на 1100 км кампрэсарную станцыю ў Балтыцы. Гэта блеф. Калі («Газпром» — **«НН»**) павысіць цэны, як было зроблена ў Баўгарыі, Вугоршчыне і іншых краінах былога сацлягеру, то зьявіцца вельмі хутка шлях на Захад, вельмі вялікі стымул для эканомікі, бо прадпрыемствы нікуды не падзенуцца, — давядзецца адразу ж лібэралізаваць эканоміку. Гэта адрэжа Беларусь ад Расеі, у такім разе Беларусь будзе вымушана ісьці ў Эўропу. Расея на гэта ня пойдзе, калі ў яе, вядома, няма мэты выпіхнуць Беларусь на Захад.

Іх бы задаволілі нашы ўмовы, калі б была пагроза прыходу іншай кампаніі, зацікаўленай у «Белтрансгазе», але «Газпром» — манапаліст. Нам варта скарачаць долю газу ў паліўна-энэргетычным балянсе краіны і паступова прывучаць эканоміку Беларусі да высокіх цэнаў на газ. Але для гэтага патрабуецца рэфармаваньне ўсёй эканомікі дзеля зьяўленьня ў прадпрыемстваў дастатковых абаротных сродкаў на аплату энэрганосьбітаў, зьяўленьня канкурэнтаздольнай прадукцыі. Трэба пачынаць гуляць па сусьветных правілах, каб акрамя расейскага на рынку зьявіўся і заходні капітал на роўных умовах».

**БелаПАН**




## Пасажыры патрабуюць «Незалежнасьці»

Спачатку аб'ява дыктара «Наступная станцыя — «Плошча Леніна» выклікала ў цягніках сьмех і гоман. Цяпер пасажыры перайшлі да дзеяньняў. Зброяй «пралетарыяту», што езьдзіць у мэтро, сталі асадкі, маркеры ды прылады для манікюру. «Леніна» на схемах мэтро крэсьляць, перапісваюць, абдзіраюць. Засталося няшмат непапаганеных ільлічоў. Самыя вынаходлівыя адклейваюць новую назву «Ракаўскай», і замест «Плошчы Леніна» выходзіць «Плошча Спартыўная». Таксама да назвы дапісваюць азначэньні: «Плошча Леніна-забойцы», ці «Ленін жыў, Ленін жыве і г.д.»

Як вынікае з размоваў зь лідэрамі юнацкага супраціву, ніводная з апазыцыйных арганізацый гэтга не ладзіла. Адбываецца, так бы мовіць, стыхійная творчасьць масаў. Папросту лёзунг уладаў: «Беларусь сегодня — советская Белоруссия», відаць, не адпавядае настроям людзей.

**Аляксей Шэін**

# Пераседзець Пуціна!

Ён перастаў хадзіць па цэхах, калгасныя палі азірае зь верталёта, не рызыкуе прайсьціся па менскай вуліцы... Агульная схема — ад абагаўленьня, ад усеагульнае любові да расчараваньня і нянавісьці — спрацавала і ў Беларусі. Цяпер ён баіцца свайго электарату.

Варта было б кінуць яму выклік: калі ты мужчына, калі сапраўды лідэр, дай згоду на правядзеньне мітынгу на тым самым Бангалоры, прыйдзі сам на гэты мітынг і выступі на ім, распавядзі пра посьпехі ў гаспадарцы, ахове здароўя, паляпшэньне дабрабыту... Ты дай згоду на правядзеньне такога мітынгу, а мы забясьпечым яго масавасьць. Можа стацца, што ты паўторыш рэкорд свайго старэйшага сябра Фідэля. Той любіў выступаць на пляцы перад народам.



У яго неспакойнае сумленьне. Ён баіцца сьмерці. «Апазыцыя вострыць шаблі», — паведаміў ён прыкормленым расейскім журналістам. Ён ня можа ўявіць, як гэта дэмакраты не паномсьцяцца на ім, як гэта Эўропа ня выдасьць яго кашчавай і бязносай. Ён баіцца суду. Яму хацелася б пазьбегнуць усякае адказнасьці. Бо трэ будзе адказаць на пытаньні: хто загадаў зьбіваць народных прадстаўнікоў у зале паседжаньняў парлямэнту, дзе абяцанае кіно з гэтым зьбіваньнем, дзе Юры Захаранка, Віктар Ганчар, Анатоль Красоўскі і Зьміцер Завадзкі? Ён баіцца (бо такое ў гісторыі не навіна), што ягоныя ж паплечнікі, міністры, пракуроры і судзьдзі станула галоўнымі сьведкамі абвінавачаньня і плакацьмуцца, як яны пакутавалі ад свайго шэфа, звальвацьмуць на яго ўсю віну і адказнасьць. Таму ён увесь час тасуе адну і тую ж калоду і запалохвае яе.

Яму нічога не застаецца, як аберуч трымацца за ўладу. Улада патрэбная яму і каб пазьбегнуць адказнасьці, і таму што ня выветрылася мара пра «шапку Манамаха». Ну, не ўдалося абыграць Крэмль у бізантыйскіх гульнях у першым раўндзе, не ўдалося выскачыць на ўсерасейскі прастор у 2000 годзе — мажліва, удасца другі раз: а раптам у Пуціна, які ў 2008 г. пойдзе ў адстаўку, будзе слабы пераемнік, а раптам у самы бліжэйшы час у Расеі здарыцца форс-мажорная сытуацыя?

Мы нават не здагадваемся, колькі сродкаў траціцца дзеля «шапкі Манамаха». У прыватнасьці, якія сумы выдаткоўваюцца на рэклямна-інфармацыйныя мерапрыемствы ў расейскіх рэгіёнах, на працу ў маскоўскіх калідорах улады. Дзеля гэтае мэты й вядзецца далейшая русіфікацыя Беларусі, дзеля яе й стараюцца ўбіць у галовы паспалітага люду, што саюз Беларусі й Расеі — рэальнасьць.

Гэтай мэце падпарадкаваная сёньня й галоўная задача — пераседзець Пуціна. А каб пераседзець Пуціна, трэба ўтрымаць уладу ў Беларусі. Якімі сродкамі і мэтадамі? Яшчэ ў 1998 г. было вядома, што пры захаваньні старога выбарчага закону, на падставе якога ўдалося прыйсьці да ўлады, выбары выйграць ня ўдасца. Нават для таго, каб вырваць «элегантную перамогу» паводле новага выбарчага закону, у 2001 г. спатрэбіліся не абы-якія намаганьні. А тым часам электаральная падтрымка ўпала ніжэй ад калена. І гэта — праблема сродкаў і мэтадаў утрыманьня ўлады ў Беларусі — ёсьць прычынаю галаўнога болю, які даймае яго і ягонае найбліжэйшае атачэньне.

**Анатоль Сідарэвіч**

## Калі цяперашняя дзяржава лічыць Геніюш ворагам, значыць гэта не беларуская дзяржава,

мяркуе гісторык Міхась Чарняўскі


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Вярхоўны суд чарговы раз адмовіў у адказ на хадайніцтва Беларускага Хельсынскага камітэту аб рэабілітацыі Ларысы Геніюш. Гісторык Міхась Чарняўскі, які апякуецца спадчынай паэткі, лічыць, што рэабілітацыя мела сэнс, калі паэтка была жывая: «Яшчэ Максім Танк настойваў, каб яна падала заяву на грамадзянства. Тады б яе можна было прыняць у Саюз пісьменьнікаў, даць кватэру ў Менску, прыпісаць да пісьменьніцкай палікінікі, адправіць у пісьменьніцкую санаторыю ў Кактэбэль. Аднак паэтка на паклон да ўладаў не пайшла.

Няма патрэбы рэабілітаваць яе цяпер, бо яна працавала ўсё жыцьцё на пабудову незалежнай беларускай дзяржавы. І калі сёньняшняя дзяржава лічыць яе ворагам, дык гэта не беларуская дзяржава. Ніхто ж не пачынае рэабілітоўваць савецкіх партызанаў, якія ў вачах фашыстаў былі бандытамі, бо ваявалі ня ў форме. Ні пра якую рэабілітацыю ня можа ісьці й гаворкі: Ларыса Геніюш не зрабіла злачынства».

**9 жніўня ў Зэльве будзе адзначацца дзень народзінаў Геніюш. Будзе паніхіда ў царкве, выступы бардаў і гарадзенскага хору «Бацькаўшчына».**

# Што ня згіне ў Леце



Лета. Адпачынак і забыцьцё, мёртвы сэзон.

Лета-2003 згубіць у шуме лісьця, шэпаце чутак і шолаху газэтных старонак спалоханую мітусьню афіцыёзу вакол пахаваньня Васіля Быкава. І тое, як ставілі й выводзілі вайсковую варту ў Доме літаратара, і тое, як спрабавалі сарваць з труны бел-чырвона-белы сьцяг, і тое, як гэбісты выграбалі з-пад заваляў кветак прэзыдэнцкі вянок, увесь час выстаўляючы яго пад быкаўскі партрэт з чорнай стужкай. Забудзецца дэманстратыўны прэзыдэнцкі візыт да сьветлагорскае цэлюлёзы, высылка Селіна і выступ Лукашэнкі ў праграме «Асабісты ўклад» на НТВ. Застануцца кнігі Быкава і дзясяткі тысячаў людзей пад бел-чырвона-белымі сьцягамі на праспэкце Скарыны.

Гісторыя апусьціць на дно ўсіх буйных і дробных начальнікаў, якія сёлета спрабавалі прынізіць беларушчыну. Сплывуць і перайменаваньне мэтро, і *двуязычие* на БТ, і выцісканьне «Сталіцы» з FM-этэру. Ужо канулі ў лета-2003 г. катэджы «Сонечнага» ў Курапатах — гэтаксама неўзабаве распусьціцца ў каламутных водах Лукашэнкавага дзесяцігодзьдзя спадарыня, прызначаная новай дырэктаркай Коласаўскага ліцэю, што прыходзіла на працу зь міліцыянтамі. Ліцэй застанецца ліцэем, Курапаты Курапатамі, а незалежнасьць — незалежнасьцю.

Забудзецца і ўрад Нашаў вакол гіт... вiцкага, які недаплаціў калгасьнікам за малако, і ўрад Сідорскага, які разьмяняюць на чарговую палітычную драбязу. Сплывуць у нікуды і «Славянскі базар», і рухі за рознае жыцьцё, канстытуцыйныя акты й рэфэрэндумы.

Сьцiхне ўсплёск вады, разыдуцца колы, лёгкімі хвалькамі на разьвітаньне пацалуюць берагі, асядзе ўвесь бруд, і зноўку ў глыбіні замрэ нябёсны спакой.

І няхай напярэдадзе восень, і да вясны яшчэ далёка — Беларусь застанецца.

**Павал Севярынец**

# Справа зьніклых: новы паварот

Працяг са старонкі 1.

Упершыню пра «расейскі сьлед» у справе зьнікненьняў напісаў нейкі **Віктар Клінко.** У 2001 г. яго нарыс выйшаў асобнай брашуркай. Паводле Клінко, атака на Лукашэнку плянавалася з дапамогай справы журналіста Зьмітра Завадзкага. Аднак «яшчэ ня позна» Лукашэнку нанесьці прэвэнтыўны ўдар і вычысьціць беларускія органы ўлады і сілавыя структуры ад расейскай агентуры, пісаў таямнічы Клінко.

Справа ішла да прэзыдэнцкіх выбараў у Беларусі. Зьніклыя, як гэта ні цынічна гучыць, сталіся небясьпечнай зброяй у руках розных палітычных сілаў. Апазыцыя спадзявалася, што ўлада будзе дыскрэдытаваная інфармацыяй пра яе саўдзел у злачынствах. Зноў жа чакалася, што не застанецца ў баку і Расея, якая «была ў курсе ўсіх падзеяў». Але выкіду ў прэсу самага сур'ёзнага кампрамату на беларускі рэжым не адбылося. Ці то Масква ня мела чаго сказаць, ці то вырашыла пакуль устрымаецца.

## Адказ Алкаеву

Нагадаем, што ўпершыню падборка дакумэнтаў у справе зьніклых палітыкаў была абнародаваная ўлетку 2001 г. Спачатку ў чэрвені з заявай выступілі супрацоўнікі пракуратуры **Зьміцер Петрушкевіч** і **Алег Случак**, якія зьехалі ў ЗША.

А ў ліпені 2001-га кандыдат у прэзыдэнты **Уладзімер Ганчарык** агучыў адразу некалькі сэнсацыйных дакумэнтаў. Гэта былі цяпер ужо ўсім добра вядомыя рапарты генэрала **Мікалая Лапаціка** і начальніка сьледчага ізалятару **Алега Алкаева**.

Зьяўленьня новага дакумэнту давялося чакаць два гады. У лютым 2003-га А.Алкаеў на старонках «Для служебного пользования» пісаў: «І яшчэ пакуль ніхто не адказаў на пытаньне: што было напісана ў пастанове аб арышце Паўлічэнкі? Так, ён быў арыштаваны прэвэнтыўна, але ўсё роўна трэ было б штосьці напісаць у пастанове». Пасьля публікацыі ксэракопіі «Пастановы аб прымяненьні прэвэнтыўнага затрыманьня» ў газэце «Народная воля» ад 29 ліпеня 2003 г. адказ на пытаньне Алкаева быў дадзены:

«У матэрыялах апэратыўнай распрацоўкі маюцца пэўныя зьвесткі пра тое, што Паўлічэнка Дзьмітры Валер'евіч зьяўляецца арганізатарам і кіраўніком злачыннай групы, якая займалася выкраданьнямі і фізычным зьнішчэньнем грамадзянаў. У прыватнасьці, кіраваная Паўлічэнкам Дз.В. злачынная група мае дачыненьне да забойства 5 жніўня 2000 гр.Самойлава Г.В., лідэра незарэгістраванай Беларускай рэгіянальнай арганізацыі «РНЕ», а таксама да забойства іншых асобаў».

## Фралоў крыніцаў не раскрывае

На падставе гэтага 22 лістапада 2000 г. старшыня КДБ **Уладзімер Мацкевіч** пастанавіў затрымаць Паўлічэнку на 30 сутак. Апроч подпісу старшыні Камітэту пад дакумэнтам стаіць санкцыя намесьніка генпракурора Сьнігіра.

Дакумэнт апублікаваў «рэспубліканец» Валеры Фралоў. Свае крыніцы інфармацыі ён не раскрывае. Вэрсію, што ксэракопія была ім прывезеная з Масквы, у размове з карэспандэнтам «НН» генэрал пакінуў без камэнтару. На пытаньне, чаму дакумэнт зьявіўся толькі цяпер, кажа: «Так склалася».

«Я адправіў ксэракопію ў Пракуратуру, КДБ і Вярхоўны Суд, — кажа Фралоў. — Каб улічвалі, што была такая пастанова. Што, напэўна, былі падставы для затрыманьня Паўлічэнкі, калі дакумэнт падпісалі такія сур'ёзныя людзі».

З аднаго боку, у дакумэнце няма нічога сэнсацыйнага — толькі пацьверджаньне ўжо вядомых ісьцінаў (хіба толькі заслугоўвае ўвагі згадка пра забойства Самойлава). Найважнейшае — сам факт абнародаваньня пастановы за подпісам Мацкевіча. Хтосьці падае беларускаму кіраўніцтву сыгнал. І робіць гэта яўна ня беглыя апазыцыянэры. Каб гэты дакумэнт і раней быў у іх руках, ён ужо быў бы надрукаваны ў апазыцыйнай прэсе.

Пастанову аб затрыманьні Паўлічэнкі, верагодна, выцягнулі з дасье, якое можа знаходзіцца ў Расеі. Характэрна, што перад гэтым у Маскве была надрукаваная кніга «Нашествие», прысьвечаная мэханізмам «чорнага» бізнэсу ў Беларусі, зьнікненьням вядомых людзей. «Нашествие» распаўсюджваецца ў Беларусі нелегальна, пераважна ў ксэракопіях, але ў Інтэрнэце зь яго зьместам мог пазнаёміцца кожны. Расейская «Независимая газета» ў чэрвені паведамляла пра пачатак псыхалягічнай вайны супраць Лукашэнкі і пра тое, што яго «ў Маскве замовілі». Ці не ў працяг гэтага генэрал Фралоў і атрымаў зь невядомых крыніцаў згаданы вышэй дакумэнт?

## Завадзкаму зламалі хрыбетнік

Незадоўга да публікацыі копіі пастановы Мацкевіча было аднаўленае сьледзтва па факце зьнікненьня Ю.Захаранкі, В.Ганчара, А.Красоўскага і З.Завадзкага.

Працяг на старонцы 4.


КАЛЯЖ АРЦЁМА ЛЯВЫ


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Ірына Красоўская: Пры наступнай уладзе сьведкі ў чаргу стануць

**Ірына Красоўская больш не спадзяецца знайсьці мужа, але верыць, што вінаватыя будуць пакараныя.**

**«НН»: Аднаўленае сьледзтва. Ці будзе ад гэтага рэальная карысьць?**

**Ірына Красоўская:** Калі стала вядома пра аднаўленьне сьледзтва, я захацела сустрэцца зь сьледчым і перадаць яму частку хадайніцтваў. Але на наступны дзень сьледчы адмовіўся мяне прыняць, бо я была разам з адвакатам Гары Паганяйлам. Паганяйла для іх — як чырвоная хустка для быкоў... Так што аднаўленьне справы — гэта чарговая бачнасьць.

**«НН»: Абвешчана пра намер стварыць Фонд для каардынацыі дзейнасьці па пошуку зьніклых. Якая будзе ягоная роля ў вышуку?**

**І.К.:** Фонд — гэта не мая ініцыятыва. Я не разумею, навошта каардынаваць рухі і як. АГП робіць нейкую частку працы па пошуку, мы робім, дэпутаты нешта спрабуюць. Сытуацыя зразумелая, і каардынуй не каардынуй — гэта мала да чаго прывядзе. А адной структурай больш — гэта зноў бюракратычныя гульні, фонд трэба рэгістраваць, нешта называць, разьмяркоўваць абавязкі. Я і Сьвета Завадзкая ня будзем у ім удзельнічаць. Тут нашыя стратэгіі зь Зінаідай Ганчар моцна разыходзяцца. Яна якраз на тым паседжаньні фонду сказала, што жанчыны не павінны ўмешвацца ў палітыку, павінны гаварыць толькі пра сваіх мужоў, а пра палітыку гаворка ня йдзе.

**«НН»: А якая Вашая пазыцыя?**

**І.К.:** Алкаеў казаў, што каля трыццаці высокапастаўленых людзей ведаюць праўду пра зьнікненьні. Але ўсе маўчаць, баяцца за сябе, за сям'ю. Лішняе слова — і цябе няма. Таму адзінае выйсьце — памяняць гэтую ўладу. Пры наступнай уладзе ахвотныя сказаць у чаргу стануць. Я не разумею, як можна расьсьледаваць гэтыя справы, ня ўлазячы ў палітыку. Можна гадамі і стагодзьдзямі казаць: «Якая я бедная-няшчасная, дзе мой муж?» А вынікаў ня будзе ніякіх.

**«НН»: Можа, Анатоль, Віктар Ганчар і іншыя зьніклыя яшчэ знойдуцца?**

**І.К.:** Я надзею згубіла яшчэ пазалетась. Кожны раз я перачытвала тыя дакумэнты, я разумела, што ўсё напісанае — праўда. Што Анатоля няма. Трэба глядзець праўдзе ў вочы. Наколькі я ведаю, Зінаіда Ганчар яшчэ чакае. Калі мы езьдзілі ў Парыж, яна была ўпэўненая, што яны жывыя. Але я размаўляла з Алкаевым, ён пацьвердзіў тыя свае словы, і я зразумела, што, хутчэй за ўсё, яны забітыя.

**Гутарыла Вераніка Дзядок**

# АМОН на ліцэістаў

- Раман пра Гары Потэра стаў у Беларусі чорнай явай

Змаганьне за ліцэй доўжыцца трэці месяц. Жнівень абяцае быць гарачым — мусіць вырашыцца, куды прыйдуць ліцэісты 1 верасьня. Бакі пераходзяць да актыўных дзеяньняў.

Чыноўнікі з гарадзкога камітэту адукацыі 29 і 30 ліпеня запрасілі бацькоў ліцэістаў на перамовы. Зьявіліся толькі дзьве сям'і. Астатнія засталіся вернымі прынцыпу: «Гэтыя навучэнцы ў гэтым будынку ў гэтых настаўнікаў».

Уладзімер Колас, якому выкладчыкі даверылі прадстаўляць іх на перамовах, 30 ліпеня сустрэўся з намесьнікам міністра Казімерам Фарынам. Вынікам стаўся «воўчы білет» для настаўнікаў: абураны чыноўнік адмовіўся ўладкоўваць іх на працу, насуперак ранейшым заявам. У той самы дзень прайшло першае паседжаньне Камітэту абароны ліцэю з удзелам выдатных прадстаўнікоў навукі і інтэлігенцыі.

31 ліпеня ліцэісты арганізавалі «жывы калідор» каля камітэту адукацыі. Бацькі й дзеці прыйшлі туды ў 8.30, калі чыноўнікі ідуць на працу — іншыя спробы сустрэцца зь імі скончыліся нічым. Падчас «жывога калідору» быў пачаты збор подпісаў у абарону ліцэю. Цяпер іх ужо больш за чатыры сотні.

1 жніўня, перад пачаткам прэс-канфэрэнцыі А.Лукашэнкі, ліцэісты раздавалі расейскім журналістам улёткі з інфармацыяй. Супрацоўнікі прэзыдэнцкай аховы затрымалі дзьвюх ліцэістак, аднак не рызыкнулі дзейнічаць жорстка на вачах у расейскіх журналістаў. Ліцэісты Павал М. і Паўліна П. былі затрыманыя 2 жніўня ў Цэнтральным дзіцячым парку. Там ладзіўся пэрформанс — навучэнцы пісалі крэйдай на дарожках парку: «Ліцэй Коласа — Коласу», «Я люблю ліцэй» і г.д. Міліцыю выклікала адміністрацыя. Праваахоўнікі паставіліся да затрыманых паблажліва.

Панядзелак 4 жніўня быў адзначаны кароткай акцыяй каля Мінадукацыі ды прэс-канфэрэнцыяй з нагоды ўтварэньня камітэту абароны ліцэю. Ліцэісты вывесілі на фасад будынку вялізную расьцяжку: «Адзіны беларускамоўны ліцэй ліквідуецца. Ратуйце!» Яна правісела некалькі гадзінаў і была зьнятая перад прыездам міліцыянтаў.

Гэтым скончылася марудная фаза змаганьня, калі бакі акцэнтавалі ўвагу на юрыдычных акалічнасьцях. 5 жніўня прадстаўнікі бацькоўскага камітэту сустрэліся з намесьнікам кіраўніка Адміністрацыі прэзыдэнта Алегам Праляскоўскім. Той заявіў, што рашэньне Саўміну пра ліквідацыю ліцэю абсалютна слушнае, бо ў ліцэі займаліся палітыкай. «А потым пачаў казаць, што пахаваньне Быкава ператварылі ў палітычную акцыю. Але пры чым тут ліцэй?! Улады самі ператвараюць сытуацыю зь ліцэем у палітычную», — кажа адзін з бацькоў.

У гэты ж дзень ліцэй наведалі прадстаўнікі прыватнае будаўнічае фірмы «Мэдыябуд». Аднак ані паказаць адпаведныя паперы, ані распавесьці пра аб'ём рамонтных работ яны ня здолелі. Нават выкліканыя міліцыянты прынялі бок абаронцаў ліцэю ды запатрабавалі ў будаўнікоў дакумэнты. Бацькі ліцэістаў пэўныя, што псэўдарамонт запланаваны, каб перашкодзіць дзецям пачаць навучальны год. Пагатоў стала вядома, што рамонт будзе касмэтычным (а не капітальным, як заяўлялі раней чыноўнікі). Дый на яго ў менскіх уладаў знайшлося толькі 10 млн рублёў, якія яшчэ 5 жніўня не былі пераведзеныя на рахунак «Мэдыябуду». А на абнаўленьне аднаго фасаду трэба ў чатыры разы большая сума! 6 жніўня ліцэй зноў наведалі будаўнікі. Гэтым разам зь фірмы «Гора-Трэйдынг» і зноў без дакумэнтаў. Яны патлумачылі бацькам, што яны маюць фарбаваць звонку трысьцен-увахoд у будынак. І працу разьлічваюць скончыць… да 1 лістапада. «Ды мы з бацькам зрабілі б гэта за пару дзён!» — сьмяецца адзін зь ліцэістаў.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

## Грамадзтва мусіць быць гатова да масавых акцый у падтрымку Ліцэю і ў абарону беларускага школьніцтва

Каб перашкодзіць будаўнікам, бацькі атачылі будынак. Тады да ліцэю прыбылі міліцыя і АМОН. Былыя абаронцы Курапатаў пазналі некаторых: сутыкаліся на ўрочышчы два гады таму. Ліцэісты і бацькі паселі на асфальт, міліцыянты ж пачалі адцягваць іх. Тых, хто не адыходзіў сам, адцягвалі. Падпалкоўнік міліцыі Пятро Вераб'ёў, які кіраваў апэрацыяй, казаў, што бацькі займаюцца дробным хуліганствам і перашкаджаюць будаўнікам.

Апошнія ж паставілі рыштаваньні ля аднаго акна і сышлі. Затое зьявіўся начальнік упраўленьня сярэдняй адукацыі гарадзкога камітэту адукацыі Аляксей Воранаў. У выніку перамоваў была дасягнутая дамоўленасьць: да 14 жніўня камітэт знаходзіць навастворанаму гарадзкому гуманітарнаму ліцэю дырэктара, а бацькі будуць вырашаць, ці давяраць яму сваіх дзяцей. Паўстала пытаньне і пра юрыдычную неправамоцнасьць рамонту ліцэйскага будынку. Дом на вул.Кірава, 21 — гісторыка-архітэктурны помнік, які мусяць рамантаваць толькі архітэктурныя фірмы з адмысловай ліцэнзіяй пасьля экспэртызы і дазволу Дэпартамэнту па ахове гісторыка-культурнай спадчыны. Чыноўнікі ад адукацыі гэтага нават ня ведалі.

Пасьля перамоваў з А.Воранавым абаронцы ліцэю даведаліся, што ўваход у памяшканьне перакрыла міліцыя: усярэдзіну пускалі толькі выкладчыкаў. На знак пратэсту У.Колас прыпыніў перадачу справаў і маёмасьці зь ліквідаванага Гуманітарнага ліцэю.

Тым часам ліцэісты падрыхтавалі ліст да культавай пісьменьніцы Джаан Роўлінг. Падзеі ў яе рамане «Гары Потэр і Ордэн Фэнікса» адзін у адзін нагадваюць ліцэйскія калізіі: у школу чараўнікоў прызначаная злая дырэктарка, якая не разьбіраецца ў магіі, а ў выніку сама ўстанова была расфармаваная "дзеля аптымізацыі навучаньня». Ліцэісты запрашаюць Дж.Роўлінг наведаць Беларусь, каб пабачыць, як яе казка сталася явай, ды напісаць працяг гісторыі пра Гары Потэра паводле беларускіх рэаліяў.

**Аркадзь Шанскі**

# Справа зьніклых: новы паварот

**Працяг са старонак 1,3.**

Яно цягнулася ўжо некалькі гадоў. За гэты час было ўсё: «уцечкі інфармацыі», гучныя заявы, загадкавыя сьмерці апэратыўніка Камітэту па арганізаванай злачыннасьці пры МУС **Уладзімера Французава**, сьведкі, былога амапаўца 26-гадовага **Антона Кабзара ды іншых**. І толькі адна справа была даведзеная да суду — па ёй праходзіла «група Ігнатовіча».

14 сакавіка 2002 г. былыя спэцназаўцы Ігнатовіч і Малік атрымалі пажыцьцёвае зьняволеньне, а іх саўдзельнікі — вялікія тэрміны зьняволеньня. Аднак суд, прызнаўшы іх віну ў выкраданьні Завадзкага, так і ня даў адказу на пытаньне, што ж сталася з журналістам. Ягоны калега **Павал Шарамет** лічыць, што Зьміцер быў захоплены беларускімі спэцслужбамі, якіх цікавіла, што ведае ОРТ і Шарамет пра іх апэрацыі ў Чачэніі: «Яго катавалі, зламалі хрыбетнік. Пасьля гэтага вырашылі дабіць, бо ўжо нельга было схаваць гэтае злачынства. Гэта вэрсія, якой трымаўся падчас нашых размоваў былы генпракурор Алег Бажэлка. І мне яна падаецца найбольш праўдападобнай».

### Міністар ня памятае

Генэрал Юры Сівакоў, якога дапытвалі ў якасьці сьведкі, адмаўляў, што аддаваў каманду аб выдачы «расстрэльнага» пісталета. «Я гэтага ня памятаю», — сказаў ён сьледчаму. Зьмяніў свае паказаньні ад'ютант міністра Калесьнік, які заявіў, што пісталет ляжаў у яго сэйфе.

Стала вядома, што пасьля выкраданьня Ганчара і Красоўскага невядомыя людзі, якія прадстаўляліся работнікамі міліцыі, зьдзяйсьнялі абход кватэр у раёне здарэньня. Яны цікавіліся, ці хто што-небудзь бачыў, — шукалі сьведкаў...

20 студзеня 2003 г. сьледчы пракуратуры **Ўладзімер Чумачэнка** прыпыніў папярэдняе расьсьледаваньне. Тацяна Процька ўпэўненая, што гэтым ён паказаў: «нічога не магу зрабіць больш, чым зрабіў».

Аднак у пачатку лета 2003-га расьсьледаваньне справы зьніклых было нечакана аднаўленае. Пракурор сталіцы Мікалай Кулік замяніў сьледчага, і цяпер справай займаецца **Сяргей Кухаронак**. Прычынай гэтага кроку пракуратуры стаўся найперш шырокі розгалас, у тым ліку і за мяжой, беларускіх «гучных справаў». **Алег Воўчак**, кіраўнік грамадзкай арганізацыі «Прававая дапамога насельніцтву», якая цяпер ліквідуецца Мінюстам, лічыць, што мэта аднаўленага сьледзтва — выправіць ранейшую памылку сьледчага Чумачэнкі. Студзенская пастанова Чумачэнкі сьведчыла пра існаваньне ў нашай краіне «эскадрону сьмерці», хоць і не называла ягоных удзельнікаў і гаспадароў. Цяпер жа гэты факт можа зьнікнуць з высноваў аднаўленага сьледзтва.

Жонка Віктара Ганчара Зінаіда лічыць, што аднаўленьне сьледзтва — гэта чарговая спроба ўлады забытаць расьсьледаваньне. Ня верыць у станоўчы вынік сьледзтва і Ірына Красоўская. Прагноз генэрала Фралова таксама не аптымістычны: «Будуць цягнуць справу». Таму працягваецца работа над падрыхтоўкай пазову на ўлады Беларусі ў адзін з эўрапейскіх судоў.

**Алег Тачоны**

## Дзе існуюць «эскадроны сьмерці»?



Былы афіцэр ФСБ **Аляксандар Літвіненка**: «Калі ў краіне за кароткі час адбываецца больш за два забойствы палітыкаў, якія знаходзяцца ў апазыцыі да ўлады, значыць, у спэцслужбах гэтай краіны існуе т.зв. «эскадрон сьмерці», які забівае на загад кіраўніцтва краіны непажаданых яму людзей. Гэта мы назіраем цяпер у Расеі, ва Ўкраіне і ў Беларусі».

## ХРОНІКА ЎЦІСКУ

**Суд над удзельнікам акцыі «Хочам ведаць праўду» Ўладзімерам Семенчуковым** адбыўся 24 ліпеня ў Віцебску. Судзьдзя абмежавалася заўвагай і спыніла справу. «Зуброўцы» **Павал Юхневіч**, **Аляксей Ляўковіч**, **Міхаіл Воўчак**, **Зьміцер Жамойдзік**, **Дзяніс Барадзін** 27 ліпеня былі затрыманыя на плошчы Незалежнасьці. У пастарунак разам зь імі патрапіў **Рыгор Кійко**. У **Яўгена Афнагеля** і **Ігара Віньнікава**, якія фатаграфавалі акцыю і арышт, засьвяцілі стужку і запісалі пашпартныя зьвесткі. З.Жамойдзік быў аштрафаваны на 20 базавых адзінак, П.Юхневіч атрымаў судовае папярэджаньне. М.Воўчак 31 ліпеня аштрафаваны на 30 базавых адзінак. А.Ляўковіч і Д.Барадзін — непаўналетнія. 28 ліпеня ў пастарунак за несанкцыяваны пікет трапілі сябры віцебскай суполкі КХП-БНФ **Уладзімер Плешчанка**, **Аляксандар Салаўян** і **Барыс Хамайда**. У пікетоўцаў забралі бел-чырвона-белы сьцяг і ведамасьць з подпісамі за скасаваньне саюзнай дамовы. На У.Плешчанку і А.Салаўяна склалі пратаколы. Б.Хамайду начальнік Чыгуначнага РУУС папярэдзіў, што не бярэ на сябе адказнасьці за здароўе і жыцьцё ўдзельнікаў несанкцыяваных акцыяў (перад затрыманьнем нейкія людзі спрабавалі наладзіць з апазыцыянэрамі бойку). 29 ліпеня маладафронтаўцу **Зьмітру Дашкевічу**, затрыманаму ў ноч на 23 ліпеня падчас расклейкі ўлётак, далі 14 тыс. штрафу. Пакараньне было вынесенае завочна. Справу затрыманага тады ж **Алега Гнедчыка** перадалі ў камісію ў справах непаўналетніх, а бацькі хлопца напісалі ў пракуратуру скаргу на міліцыянтаў, якія зьбілі іхнага сына.

Падчас раздачы ўлётак расейскім журналістам 1 жніўня служба аховы прэзыдэнта і міліцыянты затрымалі навучэнак Беларускага ліцэю **Тацяну С.** і **Аксану Б.** На наступны дзень, 2 жніўня, падчас акцыі ліцэістаў у парку Горкага былі затрыманыя **Павал М.** і **Паўліна П.** Усе затрыманыя ў кароткі час былі адпушчаныя.

**АШ**

ЭКАНАМІЧНАЯ ХРОНІКА

## МАЗ—МАН перайшоў да аўстрыйцаў

**Сузаснавальніца СП «МАЗ—МАН» зь нямецкага боку, кампанія «MAN Nutzfahrzeuge AG», прадала 43% сваёй долі акцыяў аўстрыйскай кампаніі, назва якой, паводле дамоўленасьці, не паведамляецца.** У фірмы MAN засталося 10% акцыяў, аднак з ліку сузаснавальнікаў яна ня выйдзе. МАЗ па-ранейшаму мае 41%. Адбыліся зьмены і ў кіраўніцтве «МАЗ—МАН». Ім цяпер кіруе беларус. У першым паўгодзьдзі прадпрыемства ўпершыню атрымала прыбытак. Пасьля «Прыёрбанку» і бровараў, гэта трэцяя сфэра, куды прыйшоў аўстрыйскі капітал.

## «Белтрансгазам» не гандлююць

**Ажно на 13,2% зьнізіўся ў ліпені аб’ём апэрацыяў з вэксалямі «Белтрансгазу» на Беларускай валютнафондавай біржы.** На гэта паўплывала няпэўнасьць вакол перамоваў з «Газпромам».

## Эмісія 1:25

**Беларусь ды Расея будуць мець «роўныя» правы на эмісію расейскіх рублёў — не 1:1, а прапарцыйна сваім ВУП, 1:25.** Пра гэта дамовіліся банкіры 1 жніўня ў Пецярбурзе на паседжаньні Міжбанкаўскае валютнае рады. Праўда, прынцыповае згоды на валютны саюз пакуль няма.

## Уборачнай камандуе прэм’ер

**Перавозчыкаў зерня вызвалілі ад платы за карыстаньне шашою Берасьце—Масква на час жніва.** Сяргей Сідорскі загадаў зьбіраць ураджай з 7-8% плошчаў штодзённа, а да 8 жніўня разьлічыцца з замежнымі пастаўшчыкамі энэргарэсурсаў.

## Заводу пагражае банкруцтва

**Віцебскаму алееэкстракцыйнаму заводу пагражае банкруцтва.** У 2000 г. прадпрыемства аддало на захаваньне Гомельскаму тлушчаваму камбінату 600 тыс. тонаў алею на 3,4 млрд руб. І ні тавару назад, ні грошай за яго не дачакаліся. У выніку ня здолелі аддаць «Беларусбанку» крэдыт. Запазычанасьць прадпрыемства — пад 6 млрд руб. Няма срокаў на закуп сыравіны: лёну і рапсу.

## Бэрлін перайшоў на лічбу

**Бэрлінская аглямэрацыя першай у сьвеце цалкам пераходзіць на лічбавы тэлесыгнал.** Гэта дазволіць пазбыцца вялікай антэны на даху, абмежаваўшыся пакаёвай. Аднак каб тэлевізар прымаў гэты сыгнал, трэба падключыць да яго дэкодэр для наземнай лічбавай тэлевізіі. Каштуе такая прылада 100—300 эўра, і на момант пераходу на «лічбу» каля 20 тыс. сем’яў, што маюць звычайныя тэлевізары, яшчэ не набылі дэкодэра. Але большасьць немцаў гэта мала турбуе — яны карыстаюцца кабэльнай ТВ (54%) і «талеркамі» (33%), якія прымаюць лічбавы тэлесыгнал і без дэкодэра. Лічбавы сыгнал перадаецца лягчэй, што дазволіць нашмат павялічыць колькасьць перадаваных каналаў.

## Амэрыканцы шукаюць танных працаўнікоў

**У найбліжэйшыя месяцы кожны дзясяты амэрыканскіі праграміст можа страціць працу на карысьць спэцыяліста з Азіі ці Ўсходняй Эўропы.** Ужо пры канцы 2004 г. кампанія «IT» пераносіць 500 тыс. працоўных месцаў у краіны, дзе рабочая сіла каштуе меней. На ўсход пазглядаюць і кампаніі, што працуюць у сфэрах сучасных тэхналёгіяў, фармацэўтыкі.

**АК, БелаПАН, АФН**

# Ці ёсьць у Расеі прыватная ўласнасьць

**Арышт генэральнага дырэктара групы «Менатэп» Платона Лебедзева нечакана выявіў ня толькі палітычныя інтрыгі ў вярхах расейскай улады, але і болевыя пункты ўласна расейскай палітычнай і эканамічнай сыстэмы, якая склалася пасьля ельцынскай дэмакратычнай рэвалюцыі 90-х гадоў. Самае балючае месца — крызыс прыватнай уласнасьці ў Расейскай Фэдэрацыі.**



«У нас так часта казалі пра сьвятарнасьць прыватнай уласнасьці, што мы прызвычаліся думаць, нібыта яна ў нас ёсьць, — піша «Русский журнал». — Мы звыкла думаем, што ў пэрыяд дэмакратычных рэформаў у руках групы прыватных уласьнікаў засяродзіліся гіганцкія фінансавыя і прамысловыя актывы. Ці так гэта? Так, ды не зусім». Сама структура алігархічнае ўласнасьці такая, што назваць яе прыватнай можна толькі зь вялікай нацяжкаю. Арышт Лебедзева адпаведным чынам высьветліў праблему.

На афіцыйным сайце групы «Менатэп», якая валодае кантрольным пакетам акцыяў «Юкасу», ёсьць цікавы дакумэнт, у якім расшыфроўваецца структура ўласнасьці нафтавага канцэрну.

У прыватнасьці, 50% акцый групы «Менатэп» належаць нейкай структуры, якая «імітуе траставы фонд». Адзіным бэнэфіцыярам трасту зьяўляецца Міхаіл Хадаркоўскі. Сам Хадаркоўскі ў свой час так пракамэнтаваў сытуацыю для газэты «Ведомости»: «...Істотная частка акцый групы «Менатэп» належыць мне не наўпрост, а праз бэнэфіцыярнае валоданьне. Я распараджаюся гэтай доляй, атрымліваю ад яе прыбытак, але калі са мной што-небудзь здараецца, яна адыходзіць наступнаму чалавеку з групы. Але калі група прадае, напрыклад, частку акцыяў «Юкасу», то палова атрыманых грошай трапляе ў спэцыяльны фонд, які трымаецца дзеля маіх інтарэсаў. То бок я магу гэтыя грошы выкарыстаць. Але ўсё гэта — пакуль я жывы і дзеяздольны. Пасьля мяне бэнэфіцыярам трасту стане названы мной чалец групы. Гэты 50-працэнтны пакет акцый групы, які знаходзіцца ў трасьце, ня можа быць зьменшаны — ён патрэбны дзеля забесьпячэньня пераемнасьці ўлады ў групе. Чальцы групы падчас працы ў «Юкасе» перадаюць права голасу ў пытаньнях распараджэньня і кіраваньня акцыямі «Юкасу» Платону Лебедзеву. Я, напрыклад, у пытаньнях продажу акцый «Юкасу» не галасую».

То бок Хадаркоўскі — алігарх. Ён атрымлівае прыбыткі ад 50% групы «Менатэп», але ня мае права імі распараджацца. Займаецца гэтым зусім іншы чалавек — Платон Лебедзеў, якому належыць права галасаваць 50-працэнтным пакетам акцый «Менатэпу» ў пытаньнях, зьвязаных з акцыямі «Юкасу». Лебедзеў можа нават прадаць тыя акцыі.

Такім чынам, як казаў Маўглі, «сьлед згубіўся». Калі Хадаркоўскі — магутны алігарх і ўласьнік «Юкасу», дык навошта выкарыстоўваць такую дзіўную схему? Згодна зь ёй ён ня можа распараджацца акцыямі «Юкасу», але затое атрымлівае прыбыткі ад іх.

Сыстэма спадкаемства ў «Юкасе» яшчэ больш дзіўная. У выпадку сьмерці ці недзеяздольнасьці Хадаркоўскага кантроль над 50% акцый «Менатэпу» пераходзіць зусім не да дзяцей ці сваякоў алігарха, як можна было б чакаць, але да прызначанага ім акцыянэра групы. Паводле газэты «Коммерсант», першым у сьпісе «спадкаемцаў» стаіць Платон Лебедзеў, за ім ідзе адзін з кіраўнікоў кампаніі Юры Голубеў, а замыкае ланцужок лорд Джэйкаб Ротшыльд.

Пасьля таго як «Юкас» адкрыў імёны сваіх гаспадароў і структуру ўласнасьці, пытаньняў стала болей, чым адказаў. Насамрэч, калі вядзецца пра прыватную ўласнасьць на акцыі «Юкасу» з боку Хадаркоўскага, дык і схема кіраваньня акцыямі, і схема атрыманьня іх у спадчыну выбудаваныя надзвычай дзіўна. Узьнікае пытаньне, ці існуе наагул прыватная ўласнасьць на акцыі нафтавага канцэрну або перад намі штучная імітацыя, якая, зьяўляючыся нібыта прыватнай уласнасьцю юрыдычна, не зьяўляецца такой на практыцы?

Чытач можа заўважыць, што прыватны ўласьнік мае права рабіць з сваёй маёмасьцю ўсё што заўгодна. У тым ліку зьмясьціць сваю маёмасьць у траставы фонд і аддаць любыя загады адносна спэцыфікі кіраваньня ёю. Аднак калі мы ўжо гаворым пра прыватную ўласнасьць і пра рынак, мы павінны прызнаць, што на свабодным рынку суб’екты мусяць прымаць рацыянальныя рашэньні. Яны павінны імкнуцца да памнажэньня сваёй уласнасьці і атрыманьня максымальна магчымай свабоды распараджэньня сваёй маёмасьцю.

Але ў выпадку зь «Юкасам» працэс ідзе ў адваротным напрамку. Міхаіл Хадаркоўскі атрымлівае прыбыткі ад трасту, але ім не распараджаецца. Платон Лебедзеў мае права распараджацца падкантрольнымі трасту акцыямі, але не атрымлівае ад гэтага выгадаў. Плюс да гэтага, невядома, ці знаходзяцца ў трасьце толькі акцыі Хадаркоўскага ці — і іншых гаспадароў кампаніі таксама. Калі гэта так, дык апошнія не атрымліваюць ад сваіх акцый у трасьце аніякіх прыбыткаў. Схема вельмі прыгожая, але выглядае надта заблытанай і ў найвышэйшай ступені нярынкавай.

Гэта, вядома, ставіць пытаньне аб тым, «ці быў хлопчык»? Ці была ў Расеі 90-х прыватная ўласнасьць? Ці гэта ўсё фантом і падман? Бо калі структура ўласнасьці ў найбуйнейшай прыватнай нафтавай кампаніі, што на працягу некалькіх гадоў старанна праводзіла палітыку адкрытасьці, зладжаная так дзіўна, дык што казаць пра іншыя расейскія камэрцыйныя арганізацыі?

Пра сьвятарнасьць прыватнай уласнасьці ў Расеі вельмі многа казалася, але ніхто ня ўзяўся праверыць, ці маецца такая ў наяўнасьці. Паміж тым, як відаць на прыкладзе «Юкасу», — гэта вялікае пытаньне.

На самай справе, як бачым, існуе нешта накшталт калектыўнай уласнасьці групы асобаў на актывы буйной нафтавай кампаніі. Гэтыя людзі прадстаўленыя ў асабістай якасьці, аніводзін зь іх ня можа перадаць маёмасьць сваім дзецям. І прыклад «Юкасу» — не выключэньне. Прыгадаем публікацыі ў друку з нагоды выкраданьня віцэ-прэзыдэнта «Лукойлу» Сяргея Кукуры. Тады пісалі, што адным з матываў магла стаць помста атачэньня аднаго зь віцэ-прэзыдэнтаў кампаніі, чыя доля была размытая і зьведзеная да нуля пасьля ягонай сьмерці. «Сваякам і родзічам» нічога не засталося.

Размытасьць структуры буйной уласнасьці — зусім не тэарэтычная праблема. Мы часта чуем заклікі да сацыяльнай адказнасьці буйнога бізнэсу. Зразумела, што заходнія бізнэсоўцы, якія валодаюць вялікім капіталам, зацікаўленыя ў ягонай перадачы ў цэласьці і захаванасьці сваім дзецям ды ўнукам. Таму яны, канечне, зацікаўлены і ў стабільнасьці сваіх краін, у зьніжэньні сацыяльнай напругі ў грамадзтве. У нас — ня так. Структура большасьці буйных прамыслова-фінансавых груп такая, што сьмерць ці адыход ад спраў галоўнага акцыянэра выклікае зусім не перадачу ягоных капіталаў і акцый спадкаемцам, а перападзел уласнасьці ўсярэдзіне групы. Праз гэта буйныя гаспадары ня зьвязваюць сябе з Расеяй. У іх няма матывацыі для працы ў інтарэсах краіны і дзяржавы, затое ёсьць зацікаўленасьць у пераводзе сваіх актываў за мяжу. Туды, дзе прыватная ўласнасьць існуе і назіраецца. Усялякія швайцарскія вілы — так, яны застануцца дзецям і спадкаемцам. Але ўласнасьць, якая знаходзіцца ў Расеі, не пераходзіць у спадчыну амаль ніколі. У Расеі ёсьць багата прыкладаў, калі сын губэрнатара ці прэзыдэнта робіцца буйным бізнэсоўцам і апораю бацькі. Аднак у асяродку расейскіх алігархаў такіх прыкладаў няма. Часткова прычынай таму — адносная маладосьць большасьці расейскіх буйных гаспадароў. Але толькі часткова. А галоўная прычына намі ўжо названая: няма прыватнай уласнасьці. Расейскія канцэрны альбо банкрутуюць, альбо захопліваюцца канкурэнтамі. Але ў спадчыну не пераходзяць ніколі. Аднак калі няма прыватнай уласнасьці — ці ёсьць тады капіталізм?

**Павал Сьвяцянкоў, «Русский журнал», www.russ.ru**

Дамінік Міхайловіч

# Рынкавыя рэйкі для ЖКГ

Сталінскі прынцып, што абмяжоўваў плату карыстальнікаў жыльлёва-камунальных паслугаў 10% іх сабекошту, урадам даўно забыты. Згодна з «Канцэпцыяй скарачэньня і ліквідаваньня перакрыжаванага субсыдаваньня на жыльлёва-камунальныя паслугі», насельніцтва ўжо ў 2005 г. мусіла на 100% пакрываць кошт камунальных паслугаў — зусім як у краінах зь «дзікім» капіталізмам, якім так пужаюць людзей афіцыйныя СМІ. Што праўда, плянавалася гэта зрабіць зусім не для ўсталяваньня здаровых рынкавых адносінаў у галіне ЖКГ, а ўсяго толькі для паніжэньня сабекошту прадукцыі прамысловасьці, якая, як сьцьвярджалася, субсыдуе нізкія тарыфы для насельніцтва. Усе на сабе адчулі, як дзяржава дагнала долю людзкіх сродкаў у пакрыцьці кошту паслугаў ЖКГ да 60% увесну. Толькі вось, паводле тае самае «Канцэпцыі», сярэдні заробак мусіў на сёньня складаць 140 даляраў, а не 120 разам з адлічэньнямі ў Фонд сацыяльнай абароны, як гэта ёсьць насамрэч.

Дарэчы, «Канцэпцыя» тая ў сэнсе падвышэньня тарыфаў перавыконвалася з апярэджаньнем недзе на год — надта ж прыйшлася даспадобы беларускаму ўраду ідэя перавядзеньня ЖКГ на рынкавыя рэйкі. Адзінае, людзі не зусім разумелі, як гэта яны мусяць плаціць за тыя ж абы-якія паслугі штораз больш і больш, хоць ані заробкі рэальныя не павялічваюцца, ані цэны й падаткі не зьмяншаюцца.

Вось і сталі плацяжы за паслугі ЖКГ чарговым дататковым спосабам выцягваньня грошай зь беларусаў. Дык і мала ж яшчэ. Зусім нядаўна Міністэрства эканомікі больш чым на 30% узьняло тарыфы на цеплавую энэргію. Сьмеху варта, але неўзабаве пасьля таго Савет Міністраў зацьвердзіў «Канцэпцыю разьвіцьця жыльлёва-камунальнай гаспадаркі на пэрыяд да 2015 г.», дзе давядзеньне долі пакрыцьця выдаткаў на жыльлёва-камунальныя паслугі насельніцтвам да 100% плянуецца ажыцьцявіць ужо толькі да 2015 г. Зразумелі ўлады (нарэшце!), што ня будзе сярэдні беларус зарабляць 250 даляраў у 2005 г.

Насамрэч, усе гэтыя канцэпцыі ўсяго толькі паперкі, а ўрад падчас нейкіх эканамічных рашэньняў улічвае, хутчэй, канкрэтныя абставіны, што склаліся на дадзены момант. Дый узгаданыя 100% зусім не зьяўляюцца канстантай. Вось накруціць Расея цэны на газ — і гэтыя 100% кату пад хвост. Альбо прыватызуюць энэргетыку і цепласеткі, зьявіцца ў гэтых галінах канкурэнцыя — і тыя 100% зьменшацца ў разу паўтара—два.

У такіх варунках мэтазгодна зрабіць толькі адно — зьліквідаваць знакамітае перакрыжаванае субсыдаваньне. Але ня тое, якое мае на ўвазе ўрад, дзе прамысловасьць субсыдуе насельніцтва, а іншае, дзе насельніцтва, і заможнае, і беднае, субсыдуе бюджэт, бюджэт нешта пакідае сабе, а рэшту дае камунальным прадпрыемствам, каб яны паставілі людзям (у тым ліку й заможным) танныя газ, ваду ды іншыя даброты цывілізацыі. Каб не выходзіла, што ўсе людзі разам субсыдуюць і чыноўніка, і свайго заможнейшага суседа.

## Viartańnie kaviarni

**Na tym tydni ŭ Baranavičach pačała pracavać pieršaja kaviarnia «Załaty roh».** U starym, adrestaŭravanym budynku naviednikam prapanoŭvajecca bolš za 30 hatunkaŭ kavy. Cikava, što na pačatku 30-ch u Baranavičach užo isnavała kaviarnia z takoj nazvaju. Praŭda, krychu ŭ jinšym miescy. Tady kaviarniaŭ było značna bolš — vidać, było vyhadna. Nie pili tak šmat piva j harełki.

## Adarvała ruku treneru

**Haloŭny trener futbolnaha klubu «Baranavičy» Miečysłaŭ Bazan trapiŭ u avaryju.** 26 lipienia ŭ jaho aŭtamabila strelila koła. Mašynu kinuła pad aŭtobus, što jechaŭ nasustrač. Paśla ŭdaru Bazanu amal adarvała ruku, tamu ŭ haradzkim špitali jaje daviałosia amputavać. Trener, adnak, źbirajecca prysutničać na hulni svajoj kamandy 9 žniŭnia. Na ciapierašni čas FK «Baranavičy» tryvaŭa zamacavaŭsia ŭ liderach 2-j lihi.

## Pačali vykidać

**Baranavicki sud pryniaŭ rašeńnie vysielić žycharoŭ čatyroch kvater biez zabieśpiačeńnia jich jinšym žyllom.** Ludzi, što ciapier stalisia vałacuhami, šmat hadoŭ nie płacili za svaje kvatery, dyj žyli ŭžo nie pa-ludzku. Zaraz budzie razhladacca sprava jašče troch siemjaŭ, jakich źbirajucca pierasialić u mienšyja kvatery. U 382 kvaterach horadu ŭžo adklučanyja «vyhody». A 2124 siamji ŭ Baranavičach atrymali papiaredžańnie ab adklučeńni, kali tyja nie likvidujć svajich zapazyčanaściaŭ.

**Rusłan Raviaka, Baranavičy**

## Ворша шукае мэра

**Ужо некалькі месяцаў Ворша ня мае кіраўніка «вэртыкалі». Былы старшыня гарвыканкаму Валянцін Майсяюк яшчэ ў сакавіку пайшоў у адпачынак, адначасова падаўшы заяву аб адстаўцы.** У іншых краінах у гэткім выпадку не пабачылі б нічога незвычайнага, але ў нас у апошняе дзесяцігодзьдзе кіраўнікі такога рангу звычайна або ідуць на павышэньне, або сядаюць на лаву падсудных. Майсяюку, здаецца, ні адно, ні другое не пагражае. У разьвітальным выступе на мясцовай тэлевізіі былы мэр (архітэктар паводле адукацыі) паведаміў аршанцам, што зьбіраецца як сьлед адпачыць ды пісаць дысэртацыю. На вакантнае месца ахвотных пакуль няма, бо Ворша — буйны горад з шматлікімі праблемамі: больш за палову прадпрыемстваў стратныя, занядбаная сацыяльная сфэра, асабліва мэдыцына, трымаецца высокі ўзровень беспрацоўя ды злачыннасьці.

## Сабор на грошы «Беларуснафты»

**26 ліпеня ў Рэчыцы асьвяцілі Сьвята-Ўсьпенскі сабор.** Там не служылі з 1948-га, а апошнія гадоў трыццаць храм стаяў парослы пустазельлем, засыпаны сьмецьцем як помнік сквапнасьці, глупству, безгаспадарлівасьці.

Толькі ў сакавіку 1999 г., дзякуючы намаганьням протаярэя Пятра Латушкі, сабор аддалі вернікам. Пакуль ішла рэканструкцыя, набажэнствы адбываліся побач, у памяшканьні былой крамы. Сродкі на рэстаўрацыю зьбіралі па мясцовых прадпрыемствах, па людзях, але найбольш ахвяравала «Беларуснафта».

24 ліпеня, за два дні да асьвячэньня, у саборы здарыўся пажар. Пацярпеў медны дах, абгарэў «барабан» пад купалам, вада трохі падпсавала ўнутранае ўбранства царквы. Але мітрапаліт Філарэт не адмяніў асьвячэньня. Для Рэчыцы яно было сапраўдным сьвятам.

**Сьвятлана Трунеўская, Рэчыца**

## Маршрутак стала меней

**Конкурсны камітэт, створаны пры Аршанскім гарвыканкаме, вырашыў з 430 маршрутных прыватных таксовак пакінуць 175, бо канкурэнцыя, якая разгарнулася паміж імі апошнім часам, не была добрасумленнай.** На самыя папулярныя маршруты прэтэндавалі па шэсьць і болей машынаў. У выніку на лініі будуць выходзіць па 30—40 таксовак з інтэрвалам руху 1—3 хвіліны. Кошт праезду складае 250—300 руб. Але на шмат якіх маршрутах ахвотных працаваць не было, бо дарогі там вельмі благія. Таму й вызначылі на гэтыя маршруты па адной машыне. Усіх прадпрымальнікаў, якія атрымалі дазвол на працу ў новых умовах, абавязалі праз тры месяцы пачаць выдаваць пасажырам квіткі праз касавы апарат. Яны будуць своеасаблівымі страхавымі полісамі, бо ў пагоні за хуткасьцю і кліентамі маршруткі неаднаразова траплялі ў аварыі. Кіроўцы будуць праходзіць рэгулярны мэдычны кантроль, а машыны — тэхнічны. Тым, хто не прайшоў па конкурсе на гарадзкія маршруты, прапанавана асвойваць прыгарадныя.

## Настаўнікі гандлююць парэчкамі

**Грашовыя паборы з бацькоў на рамонт школаў сталі звычайнай зьявай.** У Воршы клясныя кіраўнікі зьбіраюць па дзьве тысячы рублёў з кожнага вучня, хоць гэта афіцыйна забаронена. У вёсках людзі бяднейшыя, там пэдкалектывы шукаюць грошы на рамонт школьных будынкаў рознымі шляхамі. Так, у Высокаўскай сярэдняй школе вучні сабралі на прышкольных дзялянках парэчкі, а настаўнікі гандлююць ягадамі на шашы Менск—Масква: вядзерца каштуе 2,5 тыс., вядро — 5 тыс. На атрыманыя грошы плянуюць набыць некалькі слоікаў фарбы ды цьвікоў на рамонт калідору. Як бачым, матэрыяльнае забесьпячэньне школаў дзяржава паціху перакладае на плечы бацькоў ды настаўнікаў, робячы гэткім чынам адукацыю платнай.

**Яўген Жарнасек, Ворша**



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

ПОШТА РЭДАКЦЫІ

# Лукашэнка спатыкнуўся

**Часта здаралася ў сьвеце: кіраўнік, які нібыта забясьпечыў сябе ад усіх напасьцяў у «сур'ёзных» сфэрах, спатыкаецца на нейкай драбязе.** Яскравы прыклад — Клінтан з сваімі сэксуальнымі скандаламі... Лукашэнка здольны накрычаць на міністраў і дэпутатаў, звольніць хоць якога чыноўніка, забясьпечыць выбары й рэфэрэндум... Дагэтуль большасьць ахвяраў моўчкі праглынала крыўды — ну як жа, палітычная сфэра, аўтарытарны стыль кіраваньня... Але апошнія дзеяньні і выказваньні А.Л. прымушаюць думаць, што фінал не за гарамі. Прэзыдэнт апаганьвае такую *апалітычную* матэрыю, як выхаваньне дзяцей. І ня толькі праз гучнае закрыцьцё Гуманітарнага ліцэю.

Гадоў пяць таму мы не безь зьдзіўленьня пачулі кінутае нейкаму чыноўніку: «Перастаньце быць добрым чалавекам...». Думалася — выпадковасьць. Аднак адстаўленаму прэм'еру Навіцкаму інкрымінавалася тое самае: «Ён занадта добры...». І гэткія закіды трансьляваліся на ўсю краіну.

Адна зь першых рэчаў, якой вучаць дзетак нармальныя бацькі, — быць добрымі... Нават дыктатары, скарыстоўваючы парады Макіявэлі, прыкрываюцца добрымі намерамі. Вось жа, Лукашэнка, нібы той ніцшэанскі «звышчалавек», спрабуе выйсьці па-за межы дабра і зла. Хай ён потым тлумачыць расейскім правінцыяльным журналістам: «Я чалавек нязлы», хай хоць сто разоў гаворыць пра «маральнасьць дзяржавы». Гэты вусаты чалавек з тэлеэкрану замінае выхоўваць дзяцей.

Наступнікам Лукашэнкі давядзецца займацца «выпраўленьнем імёнаў». Пачынаючы з элемэнтарнага вылучэньня і размежаваньня адвечных паняткаў дабра і зла ў межах Рэспублікі Беларусі.

**Максім Доўгі**

ВОДГУКІ

# Шукайце маты ў шахматыстаў

**Зь вялікім зьдзіўленьнем прачытаў у «НН» №28 нататку А.Шэйна «Сьвята без адрэналіну», у канцы якой аўтар піша аб сваіх уражаньнях ад гульні каманды БНФ, якая яму запомнілася «стабільным расейскім матам, які не шкадаваў вушэй дзетак...»** Але падчас змаганьня, у моманты высокага эмацыйнага і фізычнага напружаньня наўрад ці выпадае зьвяртацца да сваіх паплечнікаў паводле ўсіх нормаў этыкету. Паспрабуйце ўявіць падобны зварот галкіпэра: «Шаноўны васпане левы абаронца! Ці не зрабілі б Вы ласку падысьці на бліжэйшую адлегласьць да нападніка каманды Аб'яднанай грамадзянскай партыі спадара Лябедзькі Анатоля з мэтай недапушчэньня ажыцьцяўленьня апошнім непрыязных дзеяньняў у дачыненьні да майго падахоўнага аб'екту?»

Мушу запэўніць, што вушы дзетак ніякім чынам не пацярпелі, бо з гэтай катэгорыі гледачоў на турніры былі толькі сыны аднаго з нашых гульцоў. Абодва хлапчукі займаюцца ў футбольнай школе і на трэнінгах ім надараецца чуць і больш «вытанчаныя» выказваньні.

На заканчэньне хацеў бы параіць журналісту шукаць стабільныя маты крыху воддаль ад стадыёну «Вымпел» — пад паветкай шахматыстаў. Ну, а дзятве (і дарослым) спорт толькі на карысьць. Так што заклікаю Аляксея далучацца да нашага футбольнага клюбу. Пабегаўшы гадок па пляцоўцы, можна істотна ўзбагаціць свае ўражаньні ад гэтай гульні.

**Сяргей Мудрачэнка, капітан каманды БНФ**

* * *

**Як вядома, Бог любіць Тройцу: Айцец, Сын і Дух Сьвяты.** У нашай Краіны ёсьць такая Тройца Сьвятаў. 25 Сакавіка — Дзень Беззаганнага Зачацьця (час БССР, зразумела, пэрыяд цяжарнасьці), 27 ліпеня — Дзень Нараджэньня, і ня важна, што Дэклярацыю аб Незалежнасьці прымалі вэтэраны-камуністы, яны як чыноўнікі ЗАГСу толькі канстатавалі факт нараджэньня дзіцяці і належным чынам гэта афармілі. І, нарэшце, трэці дзень — 2 лістапада — Сьвятыя Дзяды.

І дарэмна шаноўны спадар Шушкевіч у мінулым нумары «НН» наракаў на апазыцыю. У гісторыі Беларусі ён назаўсёды застанецца стаяць побач зь Зянонам Пазьняком — падобна да герояў вядомага раману Сэрвантэса.

**Літвусь Крывейта, Менск**

* * *

**Хлусьню і прыпіскі А.Лукашэнка прабачыць можа (усім віноўным абяцае і раздае пасады:** напрыклад, месца А.Вайтовіча заняў Г.Навіцкі), а любоў да Беларусі — не. Ці не галоўныя яго ворагі — нацыянальныя беларускія сьцяг і герб, пад якімі ён даваў прысягу і якім вельмі хутка здрадзіў.

**Міхал Л., Менск**

## «Камсамолка» зрабіла адкрыцьцё

**Вось што я вычытаў у «Комсомольской правде в Беларуси»:** «Як гэта ні дзіўна, але беларускую мову нашыя абітурыенты ведаюць лепей за расейскую. Толькі 7,2 працэнта за дыктант і 15 працэнтаў за пераказ атрымалі нездавальняльныя адзнакі. Зь веданьнем расейскай мовы ў нашых абітурыентаў горай: 10,5% (дыктант) і 16,7% (пераказ) атрымалі «нездавальняльна».

**Андрусь Кавалёў, Магілёў**

## Беларусь libre

**1898 год: адна імпэрыя дажывае свае апошнія часы, другая ўздымае галаву.** Стомленая шматлікімі войнамі й разбэшчаная лацінаамэрыканскім золатам Гішпанія ўпадае ў дэпрэсію, поўныя імпэту і помсты шматлікіх народаў ЗША мацнеюць. 1898 год — Гішпанія губляе сваю апошнюю калёнію Кубу, якая пры дапамозе Амэрыкі атрымлівае незалежнасьць. Так загінула імпэрыя, у якой сонца ніколі не заходзіла, гэтым самым годам нарадзілася новая краіна і новы express кактэйль «Cuba libre». Бо адзін амэрыканскі салдат зьмяшаў тыповы напой тых мясьцін — ром з сымбалем Амэрыкі — колай і мовіў «Cuba libre» — «За вольную Кубу».

27.07.03. 13-я гадавіна незалежнасьці Беларусі. Лёс заносіць мяне ў Гішпанію. Я заходжу ў бар да свайго сябра-бармэна і прашу, каб ён пачаставаў усіх прысутных гарэлкай. І проста моўлю: «За вольную Беларусь».

**Дзьм-к, Менск—Мадрыд**

## Ізноў пра «плошчу Леніна»

**Менск быў гадамі, гадамі, пакуль Ленін нарадзіўся, і ягонае імя не адпавядае ні адной вуліцы, ні адной плошчы ў Менску.** Нават расейскі горад зьмяніў імя на старадаўняе «Пецярбург». Імёнамі нараджэнцаў Беларусі і асобаў, што прычыніліся да разбудовы Менску, можна называць вуліцы, а імёны лідэраў камуністаў ня трэба ўжываць, гэта паніжае перад наведвальнікамі Сталіцы пачуцьце, які гістарычны горад крывічоў.

**Кастусь Верабей, Нью-Ёрк**

# Як на АНТ музыку выбіралі

**У панядзелак 28 ліпеня па АНТ паказалі чарговае ток-шоў «Выбар».** Як і любыя выбары ў нас, гэты быў несур'ёзны і ні ад чога не застрахаваны. Вядучы і той быў зьдзіўлены: 9822 галасы ў канцы перадачы. Я прагаласаваў тры разы. Калі галасаваньню аддацца ўсёй душой, дык цалкам рэальна за жывы этэр аддаць сотню сваіх галасоў і столькі ж разоў пачуць падзяку на чыстай ці не зусім чыстай расейскай мове.

А галасавалі на гэты раз на тэму «Ці заўважылі Вы, што на радыё стала болей беларускай музыкі?». Маўляў, добрай беларускай музыкі шмат, і яна на радыё з ранку да ночы, але на расейскую надта падобная (нешта такое сказаў вядучы на разьвітаньне). Можа, такой музыкі і стала болей, але я яе беларускай не лічу. Колькі спадзяванак на шанец пачуць родную музыку маю, у розны час пераключаючы прыймач на ўсе беларускія FM-хвалі, але «не плачь, Алиса...»

Падчас перадачы нехта справядліва зазначыў: «У нас усе станцыі на адзін капыл». Хочацца спадзявацца, што сапраўды на радыё «Мір», як сказалі супрацоўнікі гэтае станцыі, ужо гучыць 50% родных ці амаль родных твораў. Але нешта падазронае: у заяўках на гэтай станцыі *пасьля адпаведнага загаду* кожны другі выбірае беларускае.

Выснова простая для ўсіх: ствараймa якаснае! Праблем ня будзе. А як жа ўлады? — спытаюцца некаторыя. Ствараймa якаснае!

**Выпадковы глядач АНТ**

# Вэнэсуэльскі Лукашэнка праводзіць рэфэрэндум у лістападзе

## аб даверы да сябе

«Я не сыду, і не спадзявайцеся, я не сыду», — паўтарае Чавэс. Прэзыдэнт іграе на нянавісьці беднякоў да багатых. У грамадзтве расьце хваля гвалту. На гвалт чавістаў апазыцыя адказвае стварэньнем сілаў самаабароны.

49-гадовы Чавэс быў крыніцай надзеі для ўсіх убогіх Вэнэсуэлы. 6 сьнежня 1998 г. былы афіцэр-дэсантнік, які гаварыў па-простаму, быў абраны прэзыдэнтам, нягледзячы на супраціў з боку традыцыйных партыяў, вялікіх карпарцый, касьцёлу і ЗША.

За дзесяцігодзьдзі дзьвюхпартыйнае дэмакратыі — уладу аспрэчвалі хадэкі і сацдэмы — карупцыя і няроўнасьць набылі надзвычайныя памеры. Прэзыдэнт абвесьціў вайну галечы. «Калі за два гады нічога ня зьменіцца, прагаліце мяне з пасады», — прапаноўваў Чавэс. Прайшло чатыры з паловай гады.

Чавэс спадзяваўся, што ўсе праблемы краіны вырашаць прыбыткі ад нафтаздабычы, і не інвэставаў у іншыя галіны эканомікі. Малы і сярэдні бізнэс быў абкладзены падаткамі, права прыватнай уласнасьці было абмежавана. Але неспрыяльная каньюнктура на сусьветных рынках выклікала недахоп нафтадаляраў, вырас дэфіцыт бюджэту, абваліўся вэнэсуэльскі балівар, вычарпаліся валютныя запасы. 80% вэнэсуэльцаў жывуць ніжэй за ўзровень беднасьці. Амаль кожны другі — беспрацоўны. Вэнэсуэла мае найвышэйшы ў сьвеце паказчык злачыннасьці: у Каракасе за выходныя адбываецца пяцьдзясят забойстваў.

Бізнэс-колы пачалі працаваць на скіданьне прэзыдэнта. У адказ Чавэс распусьціў апазыцыйна настроены Кангрэс, зацьвердзіў шляхам рэфэрэндуму новую Канстытуцыю, якая дазваляе яму заставацца пры ўладзе 14 гадоў. Апроч таго, Чавэс стварыў у бедных кварталах так званыя «балівaрыянскія ячэйкі» — замест уласнай партыі. «Балівaрыянцы» нападаюць на дэманстрацыі і актывістаў апазыцыі, а паліцыя заплюшчвае на гэта вочы.

Партыі, прадпрымальнікаў, студэнтаў, незалежныя СМІ, прафсаюзы і царкву, што згуртаваліся ў антыпрэзыдэнцкі альянс, прэзыдэнт называе «сьвіньнямі, што вішчаць, калі іх вязуць на бойню». «Чавэс перакананы, што стаіць на чале рэвалюцыі, — кажа Мануэль Кова, кіраўнік найбольшага вэнэсуэльскага прафсаюзу CTV. — Людзей ён падзяляе на сяброў і ворагаў».

Летась у красавіку група афіцэраў скінула Чавэса з пасады. Пасьля двух дзён хаосу чавістам удалося аднавіць уладу. Загінула 55 чалавек. Чавэс абвінаваціў ва ўсім «антыдэмакратычныя сілы» і пачаў чыстку войска. «Чавэс, не сыходзь», «Чавэс, народ з табой», — скандуюць прапрэзыдэнцкія дэманстранты ў тэлекамэры. А пагаршэньне сытуацыі прыхільнікі прэзыдэнта зьвязваюць з шкодніцтвам чыноўнікаў і алігархіі.

Рэфэрэндум аб спыненьні прэзыдэнцкіх паўнамоцтваў Чавэса, якога дамаглася апазыцыя, пакажа раскладку сілаў у краіне. Праціўнікі Чавэса патрабавалі правесьці галасаваньне ўжо ў жніўні, гэта прапаноўваў і Джымі Картэр, былы прэзыдэнт ЗША, пасярэднік у перамовах улады з апазыцыяй. Чавэс настаяў на пераносе даты на лістапад. Пасьля 19 жніўня апазыцыя пачне зьбіраць подпісы за рэфэрэндум. Ніхто не сумняецца, што неабходную колькасьць зьбяруць хутка. Але прэзыдэнт упэўнены ў сваёй перамозе на самім плебісцыце.

Сапраўды, вынік рэфэрэндуму няясны, бо, паводле апошніх апытаньняў, 53% апытаных гатовыя падтрымаць кіраўніка дзяржавы, а супраць яго будуць галасаваць 42%. Апазыцыя баіцца, што Чавэс будзе высоўваць усё новыя і новыя ўмовы правядзеньня плебісцыту, і працягвае дэманстрацыі. А прэзыдэнт застаецца сабою. Падчас візыту ў арабскія краіны ён дазнаўся, што іслам забараняе ліхвярства. Гэта навяло яго на думку стварыць банкі, што не патрабуюць працэнтаў за крэдыты. Хоць незразумела, навошта тады даваць крэдыты і адкуль возьмуцца грошы.

**Сяргей Богдан**



**Ужо два гады Вэнэсуэла амаль штодня чуе cacerolajas — бразгат у каструлі, традыцыйную для Лацінскай Амэрыкі праяву незадаволенасьці. Па вуліцах Каракасу гадзінамі цягнуцца дэманстрацыі. Маніфэстанты патрабуюць адстаўкі прэзыдэнта Уга Чавэса, тыпалягічна вельмі падобнага да Аляксандра Лукашэнкі. Аднак Чавэс застаецца самым папулярным палітыкам краіны.**

### Нежывы меркаваны забойца Гангадзэ

**Былы міліцыянт Іван Ганчароў, меркаваны ўдзельнік забойства ўкраінскага журналіста Георгія Гангадзэ, памёр 1 жніўня ў турме.**

Апазыцыя сьцьвярджае, што Гангадзэ, рукамі спэцпадразьдзяленьня МУС, зьнішчыў прэзыдэнт Кучма. Улады сьцьвярджаюць, што Ганчароў стаяў на чале банды міліцыянтаў-«адшчапенцаў», якія выкрадалі людзей дзеля выкупу. Пракуратура выразна была зацікаўленая, каб Ганчароў узяў віну на сябе. Як кажуць адвакаты, яго нават катавалі.

Адміністрацыя турмы не дала ніякіх тлумачэньняў што да сьмерці Ганчарова. Яго ня стала ў шпіталі хуткай дапамогі, куды былога міліцыянта ўначы сьпешна прывезьлі з камэры. Праз два дні цела Ганчарова крэмавалі.

# Пасьля «Нашай Украіны» — «Наша Малдова»

**У Малдове паўстала новая палітычная сіла. Правацэнтрысты аб'ядналіся за два гады да парлямэнцкіх выбараў 2005 г. 19 ліпеня на ўстаноўчым зьезьдзе Сацыял-дэмакратычны альянс, Альянс незалежных, Лібэральная і Народна-дэмакратычная партыі ўтварылі саюз «Moldova Noastra» («Наша Малдова»).**



**Сэрафім Урэкян — новае імя ў малдаўскай палітыцы**

Ганаровым старшынём стаў першы прэзыдэнт незалежнай Малдовы Мірча Сьнегур. Кіраваць новым палітычным фармаваньнем будзе трыюмвірат: былы начальнік дарожнай паліцыі Вячаслаў Унціліэ, былы прэм'ер Думітру Брагіш і дзейны кішынёўскі бурмістар Сэрафім Урэкян. Апошні, дарэчы, змог адстаяць сваю пасаду на травеньскіх выбарах у цяжкай барацьбе з кандыдатам-камуністам.

У траўні, падчас мясцовых выбараў, цэнтрысты ўжо змагаліся адзіным блёкам і набралі больш за 20% галасоў, склаўшы рэальную канкурэнцыю кампартыі. Заснавальнікі Альянсу мерацца стварыць палітычную сілу, што будзе альтэрнатывай кіроўнай Партыі камуністаў. Для стварэньня новае партыі многім цэнтрысцкім палітыкам давялося адмовіцца ад сваіх пэрсанальных амбіцыяў. Выпрашана, напрыклад, што «Наша Малдова» будзе правапераемніцай толькі аднаго Сацыял-дэмакратычнага альянсу, а ўсе астатнія партыі-заснавальніцы пагадзіліся распусьціцца.

«Наша Малдова» выступае за ажыцьцяўленьне лібэральных эканамічных рэформаў, ставіць задачу інтэграцыі ў эўрапейскія структуры і заснавае, што трэба, каб кожны грамадзянін паважаў гістарычныя і культурныя каштоўнасьці карэннага насельніцтва ды румынскую мову. У галіне вонкавай палітыкі «Наша Малдова» ўважае, што інтэгравацца ў Эўропу можна «шляхам падтрымкі з боку Румыніі».

Хрысьціянскія дэмакраты, наступнікі Народнага фронту Малдовы, не ўвайшлі ў новы альянс.

**Сяргей Рак**

### У Галяндыі бракуе татаў



**У Галяндыі, дзе «цяжарнасьць з прабіркі» — зьява надзвычай пашыраная, бракуе мужчынскага насеньня.** Колькасьць донараў спэрмы зьменшылася ўтрая, калі быў скасаваны закон пра іх ананімнасьць. Шпіталі і прыватныя клінікі ратуюцца аб'явамі ў газэтах. Кабеты чакаюць да двух гадоў, пакуль зьявіцца адпаведнае насеньне.

Насуперак стэрэатыпам, магчымасьці «бацькі з прабіркі» абмежаваныя. Ад спэрмы аднаго донара можа нарадзіцца 15—20 дзяцей. Болей нельга, каб прадухіліць у будучым гіпатэтычныя шлюбы між біялягічнымі братамі й сёстрамі, якія нават і ведаць ня будуць, што яны ад аднаго бацькі або маюць супольнага дзеда.

Клопаты з спэрмаю пачаліся ў Галяндыі ў 2002 г., калі была адмененая пастанова пра ананімнасьць донараў. Цяпер любое «дзіця з прабіркі» ўжо ў 16 гадоў можа дазнацца, хто ягоны бацька. Ад 1983-га да 2000-га ў Галяндыі было зроблена 14 тыс. штучных апладненьняў.

**Франц Субель**

ЗДАРОЎЕ

# Палічы свае зубы

**Калі зубы пачынаюць ныць і небясьпечна хістацца, мы шукаем паратунку ў стаматоляга. Але, магчыма, выпадзеньне зубоў — гэта сыгнал пагрозы інфаркту ці інсульту.**

Зубы могуць быць лякмусавай паперкаю сардэчных хваробаў. Ня так даўно навукоўцы з унівэрсытэту ў Мінэсоце дасьледавалі стан здароўя 700 асобаў, старэйшых за 55 гадоў. Пад увагу браўся стан іх зубоў, а таксама крывяносных судзінаў, па якіх кроў трапляе ў мозг. Выявілася, што колькасьць склератычных бляшак у судзінах узрастае з колькасьцю адсутных зубоў. Сярод людзей, у якіх не хапала ад 1 да 9 зубоў, гэтыя бляшкі былі знойдзеныя ў 45% выпадкаў. Сярод асобаў зь яшчэ большым недахопам зубоў склероз судзінаў быў выяўлены амаль у дзьвюх трацінах выпадкаў. Мо ёсьць сувязь паміж стратаю зубоў і хваробамі сардэчна-судзінавае сыстэмы? Навукоўцы сьцьвярджаюць, што людзі, якія пакутуюць ад парадантозу, часьцей за іншых схільныя да інфаркту.

Якім чынам хвароба зубоў можа ўплываць на стан крывяносных судзінаў і сэрца? Вінаватыя бактэрыі і запаленчыя працэсы, што імі выклікаюцца. Навукоўцы з Хельсынскага ўнівэрсытэту апублікавалі вынікі дасьледаваньняў, дзе даводзілася, што людзі, у якіх былі выяўлены бактэрыі — правакатары запаленьня дзяснаў, мелі на 50% большую рызыку сардэчнае хваробы.

**МХ**

## 15 жніўня пятніца

**● БТ**
7.00, 9.00, 12.00, 15.00, 18.00, 23.00 Навіны.
7.10 «Дзіцячыя фантазіі», «Ляшарык». Мультфільмы.
7.25, 15.35 Тэлесэрыял «Дарагая Марыяна». Заключная сэрыя.
9.10 «Восеньскія яблыкі». Маст. фільм.
10.00 Сад мары.
10.30 «На скрыжаваньнях Эўропы». Нацыянальны тэлефэстываль песьні.
10.55 Падарожжа дылетанта. «Нароўля. Духоўная спадчына палешукоў».
11.10, 21.55 «Каралева сэрцаў». Сэрыял.
12.15, 18.10 «Маладыя гады». Сэрыял.
13.05 Баявік «Пагоня» (ЗША).
14.35 «Маскі-шоў».
15.20 «Высокая горка». Мультфільм.
17.15 «Псі-фактар». Сэрыял.
19.05 Камэдыя «Мядовы месяц у Вэгасе» (ЗША).
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама. Інфармацыйны канал.
21.45 Навіны рэгіёну.
22.45 Школа зласлоўя.
23.15 «Стагодзьдзе танцу». Дак. сэрыял. 2-я сэрыя.

**● СТВ**
6.30 «Паўэр рэйнджэрз, ці Магутныя рэйнджэры». Тэлесэрыял.
6.55, 15.25 «Гаджэт і Гаджэціны». Мультсэрыял.
7.20, 17.55 «Меншчына. Людзі, падзеі, факты».
7.30, 13.30, 16.00, 19.30, 22.35 «24 гадзіны».
7.50, 19.55 «СТВ-спорт».
8.00 «Сьнеданьне зь Інай Афанасьевай».
8.05 «Менск і менчукі».
8.10, 22.55 «Тэхналёгія».
8.20 Кіно: баявік «Крэпасьць-2». ЗША, 1999.
10.00, 20.30 «Аўтапанарама».
10.15 «Дыялёг з усім сьветам»: «Забароненае каралеўства». Дак. фільм.
10.45 «Тэатральныя гісторыі».
11.00 «Шалёны сьвет». Дак. фільм.
11.25, 12.00 «Віно каханьня». Маст. фільм.
12.55 «Народ супраць». Тэлегульня.
13.50 «Каменская. Забойца міжволі». Тэлесэрыял. 2 сэрыя.
15.00 «Кібэр-9». Мультсэрыял.
16.20 Кіно: маст. фільм «Шэрлак Холмз і доктар Уатсан. Паляваньне на тыгра», 5-я сэрыя.
18.05 «Філярманічны тыдзень».
18.10 «Сьвецкая хроніка».
18.20 «Менск і менчукі».
18.25 «Тэма дня».
18.35 «Каменская. Сьмерць дзеля сьмерці». Тэлесэрыял.
20.05 «Рэактыўны бокс».
20.20 «Добры вечар, маленькі...».
20.45 Кіно: камэдыя «Мамін сябар».
23.10 «Навіны СНД».
23.25 Кіно: трылер «Здрада».

**● АНТ**
8.00, 9.00, 18.00, 20.30, 23.05 Нашы навіны.
8.05 Тэлеканал «Добрай раніцы».
9.05, 19.00 «Зямля каханьня, зямля надзеі».
10.35 Сэрыял «Хлопцы з нашага гораду».
11.25 Сэрыял «Твінісы».
14.20 Камэдыя «Лэдзі Ўдача». ЗША.
16.20 Э.Радзінскі. «Залаты век авантурыстаў». Фільм 4-ы.
17.00 Баявік «Скарбы мёртвых».
18.10 «Самі з вусамі».
20.00 Час.
21.00 «Поле цудаў».
22.05 «Залаты грамафон».
23.20 Камэдыя «Паліцэйская акадэмія: Горад у аблозе». ЗША.

**● РТР**
7.45 Сэрыял «Каменская. Сьмерць дзеля сьмерці». 2-я сэрыя.
8.50 Сэрыял «Вяртаньне Будулая».
10.00, 19.00 Весткі.
18.00 Аншляг.
19.30 Мясцовы час. Весткі — Масква.
19.50 Дабранач, дзеці!
19.55 Сьвяточны канцэрт.
21.30 Прэм'ера. Дэтэктыў «Энігма» (ЗША).

**● НТВ**
9.00 «Сёньня раніцай».
9.20 Надвор'е на заўтра.
9.25 «Падарожжа натураліста».
10.00 «Кватэрнае пытаньне».
11.00, 16.00 «Сёньня» з Вольгай Бяловай.
14.35 Ток-шоў «Прынцып даміно».
16.25 Сэрыял «Хуткая дапамога-3» (ЗША).
17.25 «Каманда.ru».
18.00 «Сёньня» зь Міхаілам Асокіным.
18.35 Сэрыял «Вуліцы разьбітых ліхтароў».
19.40 Залатая калекцыя. Дэтэктыў «Ключ да Рэбэкі», 1-я сэрыя.
21.50 Супэрбокс. Оскар дэ ла Хоя супраць Мігеля Ганзалеса.

**● Культура**
15.10 «З жыцьця лекара». Тэлеспэктакль.
15.50 Дак. сэрыял «Сакрэтныя фізікі». Юлі Харытон. Фільм 2-і.
16.20 «У сьвеце танцу». «Прыгажуня ў сонным лесе».
16.45 «Камень, які зьзяе». Дак. фільм.
17.30, 23.00 Навіны культуры.
17.45 «Санкт-Пецярбурская белая ноч». Канцэрт Бэрлінскага філярманічнага аркестру.
19.00 «Бінка». Мультсэрыял.
19.05 «Скарбы затанулых караблёў». Мультфільм.
19.25 «Дзеля каханьня». Маст. фільм.
21.25 «Лінія жыцьця».
22.20 Блеф-клюб.
23.25 «Выведка, пра якую ведалі нямногія...». Леанід Ліпіцкі.

**● Эўраспорт**
9.30 Конны спорт. Кубак нацый. Дублін. Паўтор.
10.30 Футбол. Чэмпіянат сьвету U17. Емэн — Партугалія. Фінляндыя. Паўтор.
12.15 Футбол. Чэмпіянат сьвету U17. Паўднёвая Карэя — ЗША. Фінляндыя.
13.45 Мота Гран-пры. Чэхія. Жывая трансьляцыя.
16.00 Тэніс. WTA. Таронта. 4-ы дзень.
18.00 Вэляспорт. Тур Бургасу. Жывая трансьляцыя.
19.00 Футбол. Чэмпіянат сьвету U17. Гішпанія — Сьера-Леонэ. Фінляндыя.
20.00 Тэніс. WTA. Таронта. 1/4 фіналу. Жывая трансьляцыя.
21.30 Ралі. Чэмпіянат сьвету. Фінляндыя.
22.30 Ралі рэйд.
22.45 Самы дужы чалавек. Эўропа.
0.00 Сумо. Басё.
1.15 Экстрэмальныя віды спорту. Паўтор.

## 16 жніўня субота

**● БТ**
7.00, 12.00, 15.00 Навіны.
7.15 «Трышчан ды Іжота». Мультсэрыял.
7.40 5 цудаў.
7.50 «Не зявай!».
8.15 Існасьць. Духоўная праграма.
8.50 «Усё нармальна, мама!».
9.30 Экран індыйскага кіно. Баявік «У агні». 1-я сэрыя.
11.05 Здароўе. Тэлечасопіс.
11.35 «Сьпявай, душа!». «Дажынкі».
12.15 Вясёлая сямейка.
12.45 Падарожжа дылетанта. «І адрадзіўся Мазыр...».
12.55 Сола для дэбютанта. Алеся Снапок-Сарокіна (тэатральная мастачка).
13.10 Тэлевізійны Дом кіно.
13.35 «Гаспадары жывёл». Дак. сэрыял.
14.00 Сэрыял «Чыста ангельскае забойства-2» (Англія).
15.15 «Холмеч. Вясковы мэгаполіс». Відэафільм АТН.
15.35 Трагікамэдыя «Агапэ».
17.00 Драма «Чалавек з чорнай «Волгі» («Беларусьфільм»).
18.45 «На скрыжаваньнях Эўропы». Нацыянальны тэлефэстываль песьні.
19.10 Мэлядрама «Мяжа мараў» (ЗША).
21.00 Панарама. Інфармацыйны канал.
21.45 Камэдыя «Расейскі рахунак».
23.10 Начны музычны этэр.

**● СТВ**
7.25 «Дыназаўры». Мультсэрыял.
7.50 «Хіткліф». Мультсэрыял.
8.15 Камэдыя «Звычайны цуд». 1-я сэрыя.
9.30 «Дзікая плянэта»: «Дзікія зоркі. Грызуны». Дак. фільм.
10.00, 19.55 «СТВ-спорт».
10.10 «Рэактыўны бокс».
10.25 «Сьнеданьне зь Інай Афанасьевай».
10.50 «Анфас».
11.05 «Разам».
11.35 «Партрэт у інтэр'еры».
11.50, 20.10 «Граф Монтэ-Крыста». Маст. фільм.
12.45 «Рамонт».
13.05 Кіно: маст. фільм «Пад маскай Бэркута».
15.05 Праект «Адлюстраваньне»: «Падземка». Дак. фільм.
16.15 «Клюб «Белы папугай».
17.20 «Найлепшыя шоў сьвету з Урмасам Отам».
18.20 Кіно: камэдыя «Лёгкі пацалунак».
19.30 «24 гадзіны».
21.15 Кіно: трылер «Гульня ў хованкі».
22.55 «Навіны СНД».
23.10 Кіно: драма «Сын».

**● АНТ**
8.00 Сэрыял «Твінісы».
8.20 Грай, гармонік любы!
8.55 Слова пастыра.
9.10 Здароўе.
10.00, 12.00 Навіны (з субтытрамі).
10.10 «Смак».
10.30 «Вяртаньне дадому. Уладзімер Жырыноўскі. Алма-Ата».
11.15 Тайны стагодзьдзя. «Ульянавы. Невядомая сям'я».
12.10 Маст. фільм «Матрос з «Камэты».
13.45 «Ералаш».
14.05 Дыснэй-клюб: «Геркулес».
14.30 «Клуб падарожнікаў».
15.05 Сэрыял «Цёмны анёл».
15.50 «Згубленыя субмарыны. Катастрофы ў моры». Дак. фільм.
16.30 Камэдыя «Белыя росы».
18.10 Маст. фільм «Пошукі Залатога гораду». ЗША.
20.00 Час.
20.30 Нашы навіны.
20.55 Камэдыя «Пятнаццатага жніўня».
22.40 Трылер «Ліфт».
0.30 Музычны фэстываль «Крылы».

**● РТР**
8.25 Сам сабе рэжысэр.
9.25 «Адзінаццаць сяброў Оўшэна» (ЗША).
11.55 У пошуках прыгод.
13.00, 19.00 Весткі.
13.20 Дэтэктыў «Вяртаньне «Сьвятога Лукі». 1970.
15.00 Футбол. Чэмпіянат Расеі. «Тарпэда-Мэталюрг» (Масква) — ЦСКА. Жывая трансьляцыя са стадыёну «Тарпэда».
17.00 Мая сям'я.
18.00 Аншляг.
19.25 Баявік «Двайнік» (ЗША). 1999.
21.25 Прэм'ера. Маст. фільм «Бэрмудзкі трохкутнік» (ЗША). 1996.

**● НТВ**
9.05 «Кулінарны паядынак».
10.00 «Кватэрнае пытаньне».
10.50 Спорт «Лято 6 з 49».
10.55 Надвор'е на заўтра.
11.00, 15.00, 18.00 «Сёньня» з Вольгай Бяловай.
11.15 Шоў «Фактар страху».
12.05 Маст. фільм «Парыскія таямніцы».
14.10 Свая гульня.
15.20 «Жаночы погляд».
16.05 Баявік «Найлепшыя зь лепшых» (ЗША).
18.35 Баявік «Агент нацыянальнай бясьпекі-2. Цэйтнот», 1-я частка.
19.40 Дэтэктыў «Ключ да Рэбэкі», 2-я сэрыя.
21.45 «Усё адразу!».
22.20 Трылер «Гатэль жарсьці» (ЗША).

**● Культура**
11.30 «Удзячны лёсу».
12.05 «Дзіцячы сэанс». «Дамавік і Карунначка». Маст. фільм.
13.20 «Мастацтва архітэктуры».
13.45 «Партытуры не гараць».
14.10 «Знакамітыя арыі». Сцэна з опэры Л.Яначака «Лісічка-махлярка».
14.20 Зорныя гады «Ленфільму».
15.00 «Брамнік». Маст. фільм.
16.15 «Лебедзі Няпрадвы». Мультфільм.
16.40 «Вяртаньне Багоў». Дак. сэрыял.
17.35 «Рамантыка рамансу».
18.15 «Сфэры».
19.00 «Жыцьцё — доўгая, спакойная рака». Маст. фільм.
20.30 «Вялікія раманы дваццатага стагодзьдзя».
21.00 Навіны культуры.
21.20 «За двума зайцамі». Тэлеверсія спэктаклю Тэатру імя Я.Вахтангава.
23.35 «Алавяныя салдацікі», «Рой». Кароткаметражныя мастацкія фільмы.

**● Эўраспорт**
9.30 Лёгкая атлетыка. Спрынтэры. Паўтор.
10.30 Тэніс. WTA. Таронта. 1/4 фіналу.
12.00 Скачкі на лыжах з трампліну. Гран-пры. Куршэвэль. Паўтор.
13.45 Мота Гран-пры. Чэхія. Жывая трансьляцыя.
17.00 Лёгкая атлетыка. Спрынтэры. Паўтор.
17.30 Футбол. Чэмпіянат сьвету U17. Аргентына — Коста-Рыка. Фінляндыя. Жывая трансьляцыя.
19.15 Футбол. Чэмпіянат сьвету U17. Аўстралія — Нігерыя. Фінляндыя.
20.00 Тэніс. WTA. Таронта. Паўфінал. Жывая трансьляцыя.
21.30 Кік-боксынг. Кікманія. Бэлфаст. Паўтор.
23.30 Экстрэмальныя віды спорту.
0.45 Ралі рэйд.
1.00 Бокс. TBA. Паўтор.
2.00 Мота Гран-пры. Чэхія. Спэцыяльны агляд.

## 17 жніўня нядзеля

**● БТ**
7.00, 12.00, 15.00 Навіны.
7.15 «Трышчан ды Іжота». Мультсэрыял.
7.40 5 цудаў.
7.50 Мультыклюб.
8.25 Арсэнал.
9.00 «Сузор'е надзей». Нацыянальны тэлевізійны конкурс юных талентаў.
9.25 Экран індыйскага кіно. Баявік «У агні». 2-я сэрыя.
10.50 Сад мары.
11.20 «Лёс чалавека».
11.45 Музэюм. «Нязгатычныя храмы Браслаўшчыны».
12.15 «Усё нармальна, мама!».
13.00 «Ваша лято».
13.40 Сэрыял «Містэр Бін».
14.05 Сэрыял «Чыста ангельскае забойства-2» (Англія).
15.15 Сьвятыні Беларусі. «Заслаўе. Спаса-Прабражэнскі храм».
15.40 Сэрыял «Барацьба за выжываньне». Заключная сэрыя.
16.35 «Хроніка апошняга палёту». Відэафільм пра першага Героя Беларусі вайсковага лётчыка Ўладзімера Карвата.
16.45 Маст. фільм «Гарантую жыцьцё» («Беларусьфільм»).
18.15 «Славянскі базар у Віцебску-2003». Выбранае.
18.55 Трагікамэдыя «Знакамітасьць» (ЗША).
21.0 Панарама. Інфармацыйны канал.
21.50 Тэлебаромэтар. Прагноз надвор'я.
22.10 Трылер «Лэйк Плэсыд — возера страху» (ЗША).

**● СТВ**
7.25 «Дыназаўры». Мультсэрыял.
7.50 «Хіткліф». Мультсэрыял.
8.15 Камэдыя «Звычайны цуд».
9.30 Дак. фільм «Фантасмагорыя Паніна».
9.45 «СТВ-спорт».
10.00, 19.20 «Аўтапанарама».
10.20 «Сьнеданьне зь Інай Афанасьевай».
10.45 «Менск і менчукі».
10.55 «Сьвецкая хроніка».
11.05 «Арт-экспрэс». Культурнае жыцьцё сталіцы.
11.20 «Запрашаем паскардзіцца...».
11.30 «Філярманічны тыдзень».
11.35 «Плянэта людзей».
11.50, 19.40 «Граф Монтэ-Крыста». Сэрыял.
12.45 «Добры вечар, доктар!».
13.05 Кіно: «Гаваркая малпа».
14.50 Праект «Адлюстраваньне»: «Ведзьмы эры Вадалею». Дак. фільм.
15.50 «Клясыка гумару».
16.45 «Тайны вялікіх магаў».
17.40 «Залатая дзясятка Беларускай опэры. «Барыс Гадуноў».
18.10 «Асабісты інтэрас».
18.50 «Пакуль гарыць сьвечка...».
20.35 «Турпаход».
20.50 Кіно: маст. фільм «Хутчэй за гук».
22.30 «Навіны СНД».
22.50 Кіно: драма «Каралева Марго».

**● АНТ**
8.00 Сэрыял «Твінісы».
8.20 Служу Айчыне!
8.50 Дыснэй-клюб: «Легенда пра Таразана».
9.15 «У сьвеце жывёл».
10.00, 12.00 Навіны (з субтытрамі).
10.10 «Падарожныя нататкі».
10.30 Пакуль усе дома.
11.10 Дог-шоў.
12.10 Маст. фільм «Дзьве стралы».
13.55 Ералаш.11
14.15 Дыснэй-клюб: «Мышыны дом».
14.40 «Падарожжы натураліста».
15.10 Ток-шоў «Выбар».
15.55 Камэдыя «Бацька нявесты-2».
17.45 Жывая прырода. «Загадкавы кантынэнт».
18.40 Камэдыя «Вялікія тата».
20.30 Абрысы.
21.15 Маст. фільм «Горац — канец гульні». ЗША.
22.55 Фэстываль «Новая хваля».

**● РТР**
9.10 «Гарадок».
9.40 «Сто да аднаго».
10.40 Камэдыя «Вялікі памер».
12.40 «Ха». Маленькія камэдыі.
13.00, 19.00 Весткі.
13.20 Вакол сьвету.
14.20 Экспэдыцыя з Іванам Зацявахіным.
15.20 Прэм'ера. «Зброя Расеі. Армейскія дальнабойшчыкі».
16.20 Пакой сьмеху.
17.15 Камэдыя «Голы пісталет» (ЗША). 1988.
19.25 Маст. фільм «Аднойчы ў Амэрыцы». 1984.

**● НТВ**
9.00 Лятэрэя «Шар удачы».
9.15 Сэрыял у нядзелі. «Каханьне ўдаўца».
10.15 «Расьліннае жыцьцё».
10.50 Гуляем у «Кено».
10.55 Надвор'е на заўтра.
11.00, 15.00, 18.00 «Сёньня» з Вольгай Бяловай.
11.15 Шоў «Фактар страху».
12.05 Маст. фільм «Маладыя».
13.50 Смачныя гісторыі.
14.10 Свая гульня.
15.20 «Жаночы погляд».
16.00 Камэдыя «Чужыя грошы» (ЗША).
18.35 Баявік «Агент нацыянальнай бясьпекі-2. Цэйтнот», 2-я частка.
19.45 Трылер «Глыбокае сіняе мора» (ЗША).
21.50 Баявік «Замена. Апошні ўрок» (ЗША).

**● Культура**
11.30 «Удзячны лёсу».
12.00 ГЭГ.
12.15 «Дзіцячы сэанс», «Прыгоды чароўнага глёбуса, ці Штучкі ведзьмы». Мультфільм.
13.20 «Мастацтва архітэктара». Дак. сэрыял.
13.45 Ізноў пласьцінка пяе.
14.15 «Астравы».
14.55 «Шэдэўры сусьветнага музычнага тэатру. С.Пракоф'еў. Опэра «Заручыны ў манастыры».
17.50 Сьмехаанастальгія.
18.20 «Эпізоды».
19.00 «Шчаслівыя выпадкі». Маст. фільм.
20.50 «Больш чым каханьне». «Прарочыя сны Маргарыты».
21.30 «Дзяўчына тваёй мары». Маст. фільм.
23.25 «Джэм-5». Квартэт Джаан Брэкін.

**● Эўраспорт**
9.30 Футбол. Чэмпіянат сьвету U17. Фінляндыя — Мэксыка. Фінляндыя.
11.00 Мота Гран-пры. Чэхія. Жывая трансьляцыя.
16.00 Вэляспорт. Кубак сьвету. Цюрых. Жывая трансьляцыя.
18.00 Хакей на траве. Нідэрлянды. Нямеччына — Індыя. Жывая трансьляцыя.
19.30 Футбол. Чэмпіянат сьвету U17. Партугалія — Бразылія. Фінляндыя.
21.00 Тэніс. WTA. Таронта. Фінал. Жывая трансьляцыя.
22.30 Футбол. Чэмпіянат сьвету U17. Гішпанія — Паўднёвая Карэя. Фінляндыя.
23.45 Бокс. TBA. Паўтор.
1.00 Аўтагонкі сэрыі Наскар. Воткінс.
2.00 Індыкар. Мэдысан.


# Дык падпісвайся

**на газэту «Наша Ніва». Падпіску прымаюць ва ўсіх аддзяленьнях пошты, у шапіках «Белсаюздруку».**

Падпісны індэкс 63125



Вадзім Казначэеў

# «Духоўнасьць» замест Быкава



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

**Васіля Быкава варта ўзгадваць ня толькі з прычыны саракавінаў. Гэта вечная тэма, бо постаці гэткай велічыні ў Беларусі цяпер няма. Тым больш прыкра глядзець, як ставяцца да гэтай постаці беларускія ўлады. Пасьля сьмерці — як і пры жыцьці.**

Падчас нядаўняга выступу на расейскім тэлеканале НТВ Аляксандар Лукашэнка згадаў і Васіля Быкава, якога чамусьці ўпарта зваў «Васілій» — гэтак Быкава не пераназывалі нават за савецкім часам у перакладах на расейскую мову. «Я дастаткова зрабіў для Васіля Быкава да сьмерці. Я зрабіў яму ўсё жывому, пра што ён і яго сям'я прасілі», — заявіў Лукашэнка.

Сын Быкава, таксама Васіль, ужо абвяргаў у СМІ тое, што нехта зь сям'і, у тым ліку сам пісьменьнік, зьвяртаўся да Лукашэнкі. Быкаў пастаянна выказваўся наконт таго, *што* для яго зрабілі ўлады: называў сваё знаходжаньне за мяжою «выгнаньнем» і падкрэсьліваў, што ў Беларусі яму не даюць ані жыць, ані пісаць.

Насамрэч усё, што Лукашэнка «зрабіў для Быкава да сьмерці», адпавядала таму, што ён зрабіў пасьля яе. Усё, так бы мовіць, у гармоніі.

Падчас сваіх выступаў, прысьвечаных дню вызваленьня Менску ад нацыстаў, Аляксандар Лукашэнка ніводнага разу не згадаў імя пісьменьніка-франтавіка. Затое выдаў шмат разважаньняў наконт «ролі лідэра ўсходнеславянскай духоўнасьці». Выступаючы на вайсковым парадзе, кіраўнік дзяржавы паведаміў сэнсацыйную навіну: «Мы пабудавалі новую краіну — моцную, вольную і незалежную». Як высьветлілася, «наш гістарычны арыенцір — дэмакратычная дзяржава ў адзінай эўрапейскай сям'і народаў», — але, разам з тым, «з брацкай Расеяй мы пабудуем свой саюз». Натуральна, «станаўленьне беларускай дзяржаўнасьці ідзе ў складанай міжнароднай абстаноўцы» — Савецкім Саюзе заўжды наракалі на гэтыя самыя складанасьці. Таксама ў найлепшых савецкіх традыцыях Лукашэнка павіншаваў «работнікаў народнай гаспадаркі», «асабовы склад Узброеных Сілаў» і накіраваў «самыя цёплыя віншаваньні нашай моладзі». Не забыўся нават на «працаўнікоў пасьляваенных будоўляў». Забыўся толькі на Васіля Быкава.

Хаця менавіта яго ўзгадаць было больш чым дарэчы. Раней «бацька» гаварыў пра тое, як «мы разам з расіянамі гнілі ў акопах». І калі ж ён там гніў? Наўрад ці можна гэтак ахарактарызаваць ягоную нампалітаўскую службу ў глыбока пасьляваенныя гады. А Васіль Быкаў сапраўды прайшоў вайну.

Нічога не было сказана пра Быкава і ў інтэрвію, якое напярэдадні 3 ліпеня Лукашэнка даў прыдворным тэлевізійным начальнікам. Той выступ таксама скончыўся развагамі пра духоўнасьць: маўляў, духоўная роля цяперашняй Беларусі — вядучая ва «ўсходнеславянскім этнасе», да якога чамусьці былі далучаныя палякі й баўгары. Ім разам з расейцамі да ўкраінцамі прапанавана да нас «падцягвацца». У якасьці прыкладу «лідэрства» было пададзенае «народнае веча — нашыя пяцігадовыя зьезды» і рэфэрэндумы («усенароднае веча своеасаблівае — гэта ўласьціва толькі славянам»): маўляў, мы ўсячасна раімся з народам.

Тут выявіліся хібы ў Лукашэнкавай гістарычнай адукацыі: на самай справе рэфэрэндум зусім не зьяўляецца спэцыфічна славянскай формай дэмакратыі. Ці мо ён меў на ўвазе беларускія рэфэрэндумы, на якіх (роўна як і на выбарах) ствараюцца ўсе магчымыя перашкоды для іншадумцаў, а афіцыйны вынік мала залежыць ад таго, як прагаласавалі людзі? А пра «пяцігадовыя зьезды» гаварыць усур'ёз наагул немагчыма: гэта паказуха ў чыста саўковым стылі.

Пра «духоўнасьць» цяперашняга беларускага кіраўніцтва можна пісаць вельмі і вельмі шмат. І за чарговым разам улада найяскравейшым чынам паказала сваю страшэнную, проста пачварную бездухоўнасьць менавіта ў стаўленьні да Быкава.

Прыдворныя тэлеканалы паведамлялі пра яго сьмерць неяк між іншым — пасьля больш надзённай навіны пра тое, што А.Лукашэнка выправіўся на прэм'ерны паказ «Настасьсі Слуцкай». А ў дзень пахаваньня найпершага сучаснага клясыка беларускай літаратуры прэзыдэнт накіраваўся па неадкладных справах у Сьветлагорск.

Чаму разьвітаньне з Васілём Быкавым ня сталася нацыянальнай жалобаю? Не, на самай справе, вядома, сталася — але чаму ўлада не абвесьціла жалобы афіцыйна? Калі Лукашэнка, як ён сам сказаў, вырас на **«паэзіі Быкава»** — яму варта было пераступіць цераз палітычныя разыходжаньні і ўстрымацца ня толькі ад прагляду, але і ад паказу бляхбастэру, як і ад іншых забаваў. Дзеля духоўнасьці.

А можа, прычына ганебных паводзінаў улады — ня толькі ў палітычных супярэчнасьцях з сучасным клясыкам, а ў звычайнай зайздрасьці і дробязнай нізкай рэўнасьці? Афіцыёзная ж прапаганда настырна пнецца давесьці, нібыта ўсім, што ёсьць добрага ў нашай краіне, мы абавязаныя аднаму чалавеку (праўда, прапагандысты разам з «бацькам» так і ня могуць выдумаць, чым канкрэтна — таму і вярзуць розную лухту накшталт «духоўнага лідэрства»). Ужо



нават дзяржаўную незалежнасьць Беларусі імкнуцца выставіць заслугаю дзеяча, які ў падмурак сваёй палітыкі паклаў аб'яднаньне з Расеяй. «Рэальна ж мы будуем незалежнасьць зусім нядаўна — напэўна, з часу абраньня прэзыдэнта», — заявіў, з уласьцівай яму сьціпласьцю, сам Лукашэнка. Гонар і славу Беларусі нясе на магутным карку выключна ён (ну яшчэ, хіба, некалькі выбітных спартоўцаў — далёка ззаду). Што ж, пэўная рацыя тут ёсьць. Галоўны беларускі алімпіец сапраўды прынёс такую славу, што наша краіна няхутка ад яе адмыецца.

Дзяржаўныя службоўцы, што зьбіраліся ўзяць удзел у грамадзянскай паніхідзе, павялі сябе настолькі ж «духоўна», як іхні «бацька». Ня толькі міністар культуры Л.Гуляка, дэпэктыўшчык і дэпутат М.Чаргінец ды іншыя пакінулі залю — былі нават адклікана вайскоўцы: ганаровая варта і аркестар. Гэтак прадстаўнікі ўлады пакрыўдзіліся на тое, што ў залі, як сказаў на БТ галоўны камэндант Узброеных Сілаў А.Грыцаў, былі «сьцягі зь **беларускай сымболікай**».

Але ж менавіта беларускі, бел-чырвона-белы сьцяг быў для Васіля Быкава родным, і сваіх прыхільнасьцяў ён не хаваў. Няхай сабе дзяржслужбоўцы гэтых прыхільнасьцяў і не падзяляюць — але яны былі абавязаныя паставіцца да іх з павагаю, тым больш у час разьвітаньня. І хіба ж «духоўна» з боку Лукашэнкі на падставе наяўнасьці сьцягоў, якія яму не падабаюцца, называць пахаваньне «палітычнай вакханаліяй», у якой ён «не знайшоў магчымасьці ўдзельнічаць»? Праяўляць агрэсіўную варожасьць да ўсяго, чаго не ўхваляеш, — гэта і значыць нагнятаць «канфрантацыю ў грамадзтве».

Як гэта — «падцягвацца ў духоўным пляне» да лукашэнкаўскай Беларусі? Што рабіць дзеля гэтага: душыць усялякае іншадумства? Хлусіць на кожным кроку? Не даваць жыцьця сваім найбольш выдатным пісьменьнікам?

У апошнім, аднак, улада абвінавацiла чамусьці не самую сябе, а карэспандэнта расейскага НТВ Паўла Селіна. І дэпартавала яго з адной часткі «саюзнай дзяржавы» ў другую.

Той факт, што для «зачысткі інфармацыйнай прасторы» рэжым скарыстаў сьвяты момант пахаваньня Васіля Быкава, таксама сьведчыць зусім не пра духоўнасьць. А пра цалкам адваротнае: няма для іх нічога сьвятога. Ужо б падшукалі іншую дачэпку, хоць бы дзеля прыстойнасьці!

Паўла Селіна абвінавацілі яшчэ і ў «дэзінфармацыі». Чаму гэта не паставіць у віну дзяржаўным СМІ, якія паведамлялі пра «словы спачуваньня» Гуляці і Чаргінца. І пра тое, што Васіля Быкава пахавалі з «воінскімі ўшанаваньнямі». З усіх «воінскіх ушанаваньняў» я заўважыў на магілках толькі адно: месца пахаваньня перад цырымоніяй ачапілі памаранчавымі стужкамі з надпісам: «МІЛІЦЫЯ, ПРАХОД ЗАБАРОНЕНЫ!»

Пры такой пунктуацыі слова «міліцыя» чытаецца не інакш як зварот. Прышпілілі забарону самі для сябе. І бездакорна выканалі: міліцыянтаў — прынамсі, ва ўніформе — на пахаваньні было мала, а да магілы яны не падыходзілі наагул.

Затое аддаць Васілю Быкаву даніну пашаны, памяці і смутку прыйшлі дзясяткі тысячаў тых самых «простых людзей», пра якіх (на словах) так турбуецца рэжым. Іх колькасьць, паводле самых сьціплых падлікаў, ацэньвалася ў 50 тысяч. Гэта нягледзячы на звычайны працоўны дзень. Людзі паказалі, што яны непараўнальна больш духоўныя за ўладу, насуперак якой нейкая духоўнасьць у Беларусі яшчэ захоўваецца.

Ясна, што ня ўсе з тых, хто прыйшоў на разьвітаньне, падзялялі палітычныя погляды Быкава. Далёка ня кожны гатовы, напрыклад, сьледам за Быкавым лічыць Зянона Пазьняка *«мэсіяй»*. Але каму гэта замінала? Хто з нармальных людзей у той момант пра гэта думаў? Толькі наша «духоўная» ўлада.

Яно, пэўна, і дзякуй Богу, што гэтак адбылося. Чырвона-зялёныя сьцягі і «адухоўленыя» пысы чыноўнікаў глядзеліся б на разьвітаньні з Васілём Быкавым надта недарэчна.

Між тым, сам Васіль Быкаў ніколі ня меў ілюзіяў наконт «духоўнасьці» лукашэнкаўскай улады. У інтэрвію газэце «Аргументы и факты» ён прыгадаў «эскадроны сьмерці», якія створаны ўрадавымі структурамі і зьнішчаюць людзей», і параўнаў сытуацыю ў Беларусі з **«канцлягерам»**. Будзем спадзявацца, што ўладзе хопіць «духоўнасьці» не дэпартаваць прах Васіля Быкава зь Беларусі за «падрыў аўтарытэту органаў улады». Хопіць таго, як яго тут цкавалі пры жыцьці. А «аўтарытэт улады» падрывае яна сама, і перш за ўсё — сваёй бездухоўнасьцю.

Да таго ж, «бацька» на ролю «духоўнага лідэра славян» прызначыў сябе сам, літасьціва дазволіўшы астатнім славянскім краінам «за намі падцягвацца». Ці ж гэта духоўна? Альбо бессаромна? Калі «прызнаным маральным аўтарытэтам Эўропы» заходнеэўрапейцы называюць Вацлава Гаўла (які, дарэчы, лічыў за гонар прэзэнтаваньне ў ягонай краіне Васіля Быкава) — гэта зразумела. Хто кажа пра «духоўнае лідэрства» Лукашэнкі, акрамя яго самога (і асобных расейскіх звязіністаў)? Хто зьбіраецца «падцягвацца» ў духоўным пляне да лукашэнкаўскай Беларусі? Што яны павінны рабіць дзеля гэтага: душыць усялякае іншадумства? Хлусіць на кожным кроку? Не даваць жыцьця сваім найбольш выдатным пісьменьнікам?..

Дый якое дачыненьне ўвогуле мае наша ўлада да духоўнасьці? Вядома, што дыктатура трымаецца на грубай сіле. І ўсе тыя прымітыўныя, зь філязофскімі патугамі, развагі пра нейкую «духоўнасьць» выкліканыя толькі тым, што рэальна паказаць проста няма чаго. Немагчыма ж зрабіць акцэнт на, прыкладам, падвышэньні жыцьцёвага ўзроўню — гэта ж кожны адчувае на ўласнай кішэні. Вось і даводзіцца выхваляцца тым, чаго рукамі не памацаеш. Але якраз з духоўнасьцю ў кіроўнага рэжыму — найбольшыя цяжкасьці. Што лішні раз выявіла паказала стаўленьне да сьветлай памяці Васіля Быкава.

Хіба «духоўна» на падставе наяўнасьці сьцягоў, якія табе не падабаюцца, называць пахаваньне «палітычнай вакханаліяй»? Праяўляць агрэсіўную варожасьць да ўсяго, чаго не ўхваляеш, — значыць нагнятаць «канфрантацыю ў грамадзтве».



ГЛЕБ ЛАБАДЗЕНКА

Юлія Андрэева

# Маці-Беларусь вучыла,





## Як выпускнікі беларускай опэрнай школы здабываюць славу расейскай культуры

# Растоў-тата корміць

**Працяг са старонкі 1.**

Гэта й **Натальля Руднева** — сьпявачка родам з Самары, якая дала пуцёўку ў жыцьцё большасьці сучасных беларускіх вакальных твораў.

Гэта й **Аляксандар Анісімаў** — масквіч паводле нараджэньня і пецярбуржац паводле адукацыі, ляўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі. У заходніх СМІ ён фігуруе найчасьцей як расейскі дырыжор, а Дзяржпрэмію атрымаў у 1990 г. за пастаноўку опэры Солтана «Дзікае паляваньне караля Стаха». Гэты спэктакль быў апошняй працай галоўнага дырыжора Опэры **Ярраслава Вашчака**, але стары маэстра памёр за месяц да прэм'еры. А.Анісімаў давёў рэпэтыцыйны працэс да пераможнага канца, і ўся слава дасталася яму. Гэта была першая і апошняя ганаровая адзнака, якую сп.Анісімаў атрымаў ад беларускіх уладаў. У 1993 г. дырыжор зьвярнуўся ў мастацкую раду Опэры з хадайніцтвам аб прысваеньні яму званьня народнага артыста Беларусі. Аднак мастацкая рада адмовіла.

Той канцэрт у Опэры быў разьвітальным: Анісімаў вяртаецца на гістарычную радзіму. 24 чэрвеня ён быў афіцыйна прызначаны музычным кіраўніком Растоўскага музычнага тэатру. Расейскі міністар культуры Міхаіл Швыдкой дзівіўся, што Анісімава запрасілі на гэткую пасаду, і яшчэ болей — што маэстра тое запрашэньне прыняў.

### «Растоўская філія» беларускай Опэры

Аднак чаго тут дзівіцца? Першымі працамі Анісімава на новай пасадзе будуць опэра Вэрдзі «Рыгалета» ў рэжысуры беларускі Сусаны Цырук і балет Чайкоўскага «Лебядзінае возера» ў харэаграфічнай вэрсіі Алега Карзянкова — таксама нашага суайчынніка. Растоў даўно ўжо стаўся прытулкам для дзеячоў Опэры, якія мусілі шукаць сабе новае месца працы. «Першай ластаўкай» быў **Уладзімер Экнадыёсаў** — яскравы беларускі тэнар 80-х. Старэйшыя гледачы памятаюць гэтага калярытнага брунэта ў «Казках Гофмана», «Пікавай даме»... Аднак час не пашкадаваў ягонага голасу. У Опэры сьпеваку прапанавалі спэцыяльна для яго прыдуманую пасаду «рэжысэра па ўводзінах». Але для амбіцыяў гэтага было замала. Неўзабаве Экнадыёсаў паехаў у Растоў, адкуль быў родам, і стварыў там аматарскі тэатар «Данская опэра». Для гораду гэта быў вялізны культурны прарыў. Цягам усяго XX ст. «сёмая сталіца Расеі» з насельніцтвам у мільён не мела опэрнага тэатру. Экнадыёсаў спадзяваўся займець стартавую пляцоўку для кар'еры адміністратара і опэрнага рэжысэра, аднак пралічыўся. Кіраваць Растоўскім музычным тэатрам быў прызначаны Вячаслаў Кушчоў — загадчык абласнога ўпраўленьня культуры за саветамі, а пазьней — удалы прадпрымальнік.

Аднак Экнадыёсаў яшчэ заставаўся ўплывовай фігураю ў Растове. Зь ягонай падачы ў тэатар уладкавалася **Сусана Цырук** — дачка таленавітага беларускага дырыжора Юр'я Цырука, які так рана памёр. Спн.Сусана пэўны час працавала ў нашай Опэры. Дагэтуль у рэпэртуары захаваліся ейныя «Травіята» і «Шлюбны вэксаль». Яе шлях зь Менску ў Растоў ляжаў праз Пецярбург.

Туды яна ў 1999-м пераехала разам з мужам — дырыжорам **Міхаілам Сінькевічам**, — бо ёй паабяцалі месца рэжысэркі ў Марыінскім тэатры. На той час яе ведалі ў Расеі як аўтарку трох песенных тэкстаў да расейскамоўнай вэрсіі мюзыклу «Нотр-Дам дэ Пары» — «Сьпявай, мая Эсмэральда», «Жыць» і «La Belle». Як рэжысэрку ведалі горш. Мо таму С.Цырук і мусіла задаволіцца пасадай памочніцы рэжысэра ў Марыінцы.

### Беларускія майстры эміґруюць на ўсход

Яе чалавеку пашанцавала болей: з сэзону 2000/2001 ён намесьнік мастацкага кіраўніка Марыінскага тэатру Валера Гергіева. Сінькевіч каардынуе працу опэрнай трупы, з посьпехам выступае ў Зальцбургу і Мэльбурне, гастралюе ў «Мэтраполітэн Опэра». У Марыінскім тэатры многа беларусаў: сапрана **Ірына Гардзей**, барытон **Уладзімер Мароз**, мэцца-сапрана **Кацярына Семянчук**, тэнар **Сяргей Драбышэўскі**. Усе яны скончылі нашу кансэрваторыю і цяперака прэзэнтуюць нашую вакальную школу на найлепшых сцэнах сьвету. Піцерскія прымадонны **Вольга Барадзіна** і **Алена Зарэмба** таксама зь Менску родам.

Пецярбург прыязны да нашых талентаў, а вось Масква беларускім сьлязам упарта ня верыць. Шмат хто вучыўся ў Маскоўскай кансэрваторыі, аднак вынік заўжды быў аднолькавы. Альбо вяртаньне ў Менск (як зь піяністамі **Ігарам Алоўнікавым** і **Андрэем Сікорскім**), альбо існаваньне «чужога сярод сваіх, свайго сярод чужых». Найталенавіцейшы з маскоўскіх беларусаў піяніст **Андрэй Шыбко** не здабыў тых конкурсных узнагародаў, на якія заслугоўвае.

Затое ў Растове да менчукоў ставяцца яшчэ лепей, чым у Пецярбургу. (Хіба шматлікая мясцовая шпана можа абрабаваць). Сусана Цырук, якую сьпярша запрашалі ў Растоў на асобныя пастаноўкі, а пазьней — на пасаду галоўнае рэжысэркі, паставіла там «Сэвільскага цырульніка» з сцэнаграфіяй беларускага мастака Зіновія Марголіна, «Яўгена Анегіна», у якім загалоўную партыю сьпяваў наш барытон **Уладзімер Пятроў**. Цікава, што ў той самы час менская Опэра пакутавала на адсутнасьць рэжысэрскага нагляду.

Яшчэ адзін беларус, які ўпрыгожвае сабой культурны ляндшафт Растова, — галоўны балетмайстар тэатру **Алег Карзянкоў**, сын славутай танцоркі Аляўціны Карзянковай. (Ейную выяву мы бачым на тыльным баку сторублёўкі, дзе ўвасобленая сцэна з балету Яўгена Глебава «Выбраньніца».) Алег Карзянкоў у 24 гады стаў заслужаным артыстам Беларусі, пазьней быў запрошаны ў якасьці вядучага саліста ў Крамлёўскі балет. Балетмайстарская справа для Карзянкова пакуль новая, і ягоныя першыя крокі ня ўражваюць. Растоўская прэса пісала, што падчас пастаноўкі «Шчаўкунка» Карзянкоў, «валодаючы бліскучай балетнай тэхнікай, прадэманстраваў яўную бездапаможнасьць у ролі балетмайстра».

Затое растоўская крытыка ў захапленьні ад беларуса **Андрэя Галанава**, які зь першага дня існаваньня тэатру быў там галоўным дырыжорам. Калі Экнадыёсаў запрасіў магілёўца Галанава ў Растоў, той спачатку адмаўляўся. Аднак пасьля таго як пастаноўку ягонай любімай «Турандот» захапіў Вячаслаў Чарнуха, Галанаў згадзіўся ўдзельнічаць у конкурсе і зь лёгкасьцю перамог. У Менску яму рэдка давяралі самастойныя пастаноўкі, хіба «Шлюбны вэксаль». У Растове Галанаў выпускаў па шэсьць спэктакляў у сэзон. Абстаноўка была зусім хатняя, бо і ў аркестры, і ў хоры, і ў балеце растоўскага тэатру ня менш за палову — беларусы (што ўшчэнт разьбівае заявы нашага кіраўніцтва пра «клопат» аб культуры; нашу культуру давялі да такога жабрацтва, што людзі бягуць абы-куды). Дый пэрспэктывы адкрываліся прывабныя... Расея ж вялікая, ня выйдзе ў Растове — можна ўсё жыцьцё вандраваць па правінцыйных тэатрах, спадзеючыся на доўгачаканае запрашэньне з Масквы ці Пецярбургу.

### Фокусьнік і спакусьнік Анісімаў

Але Галанаў не пайшоў гэткім шляхам і захаваў за сабою месца дырыжора ў Беларускай опэры. Рашэньне выявілася слушным. Бо прыхільнасьці растоўскіх музычных адміністратараў хапала, пакуль на даляглядзе не зьявіўся спакусьлівы вобраз Анісімава. Апрача неадпорнай абаяльнасьці, у службовым лісьце маэстра ёсьць козыры, якія крыць няма чым. Уявіце рэакцыю наіўных растоўцаў, якім спадар Анісімаў распавядаў пра свае пастаноўкі ў Сан-Францыска ці Парыжы, пра кантакты з Растраповічам і Кабальле.

Пасьля звальненьня зь менскай Опэры маэстра меў патрэбу ў новым месцы працы. Таму запрашэньне з Растова прыдалося як найлепей. Нягледзячы на шматгадовы побыт у Менску, маэстра застаецца тут чужынцам. Графам Каліёстра, што завітаў да нас праездам з Трэцяга Рыму ў Новы Ёрк з адзінай мэтай — узяць нас у палон, асьляпіць бляскам сваіх цудаў, спакусіць наш розум, зачараваць і зьбіць з панталыку нашыя пачуцьці ды гэткім чынам даказаць самому сабе сваю багароўнасьць. Што яму да нашае барацьбы і болю, да нашых спрэчак пра лёсы Беларушчыны? Ён усяго толькі «майстар мастацтваў», то бок фокусьнік ды спакусьнік, якому самой прыродай прызначана скакаць конікам у перакрыжаваных промнях цікаўных кабецкіх позіркаў. А калі ў гэтых скоках праскоквае нешта духоўнае — дык гэта ад Бога.

### Сваё чужое

Менавіта такім зьявіўся Аляксандар Анісімаў на сваім апошнім канцэрце ў гонар закрыцьця філярманічнага сэзону. Ва ўсім, што рабіў дырыжор, было нешта ад Воланда — але адначасова і ад Гары Потэра, у якога маэстра, разам з чарадзейнай палачкай ды круглымі акулярамі, пазычыў і дробку дзіцячага ідэалізму. Анісімаў кіраваў ня столькі аркестрам, колькі публікай. Аркестар граў сам па сабе — бездакорна, стройна і чыста. І ў гэтым таксама адчуваўся прысмак чарадзейства.

Праграма была пабудаваная нібыта па заяўках Вэльзэвула. У першым аддзяленьні — «Вальпургіева ноч» з «Фаўста» і Трэці скрыпічны канцэрт Сэн-Санса. У другім аддзяленьні — «Фантастычная сымфонія» Бэрліёза. Твор поўны дэманічнай рамантыкі, бо апісвае летуценьні безнадзейна закаханага героя пасьля ўжываньня амаль сьмяротнай дозы опіюму.

Выкананьне было вытрыманае ў адпаведным духу. «Вальпургіева ноч» уражвала нетутэйшай, эльфійскай элегантнасьцю. Шарльє — дэманічны прыгажун з агністымі чорнымі вачыма, дасканалы тыпаж на ролю Мэфістофэля — гукамі сваёй чарадзейнае скрыпкі пранікнёна і моцна ўзводзіў канцэрт Сэн-Санса. Галоўнай прынадай мусіла быць «Фантастычная сымфонія». У гэтай музыцы, дзе багата жарсьцяў і мала любові, спадар Анісімаў прэзэнтаваўся дасканала. Дзеля большага эфэкту, дырыжор паклікаў сабе на дапамогу цэлае войска трубаў, валторнаў ды трамбонаў. Інструмэнты інтэлігентныя ды спагадлівыя, накшталт скрыпак і габояў, апынуліся ў меншасьці.

Але кульмінацыяй імпрэзы сталіся бісы, якіх хапіла б на паўнавартаснае трэцяе аддзяленьне. Яны былі пераважна француская — акрамя заключнага фрагмэнту з уверцюры Чайкоўскага «1812 год». Анісімаў, які адорваў публіку камэнтарамі ў стылістычны незабыўнага Мішы Каца, вытлумачыў, што гэты твор сымбалізуе «сын-

**Працяг на старонцы 12.**




**Наша культура шмат выйграла ад таго, што Анісімаў зьехаў у Растоў, а Галанаў адтуль вярнуўся.**

# Гальшаны без прывідаў



**У Гальшанах захаваўся ўнікальны габрэйскі квартал: ніводнага фасаду аднолькавага. Такія дамы цяпер можна купіць усяго за пару тысячаў даляраў.**

**Найлепшыя прадстаўнікі беларускай нацыі ўлетку сыходзяць у лясы. Мабыць, гаворыць партызанская кроў. У гэтым я пераканалася, наведаўшы гістарычны летнік на ўскрайку Гальшанаў. Будучыя архітэктары і гісторыкі прыехалі на гальшанскую зямлю, каб папрацаваць сякерамі, косамі ды пэндзлямі і, натуральна ж, сустрэцца з прывідам Белай Панны.**



**Каля знакамітага гальшанскага бару «Замак» пасьля цяжкае рэстаўрацыйнае працы (справа — аўтарка тэксту).**

Пад'ём — на сыгнал дуды (ва ўсім летніку ніводнай гітары!). Гучыць як заклік да Страшнага Суду. Пасьля сьняданку — на працу ў вёску. Рабілі на трох «аб'ектах»: замак, кляштар, царква. (Самыя лянівыя абіралі «пясчаны кар'ер», гэта значыць возера). Усе мы атрымалі даведкі, што знаходзімся тут у камандзіроўцы, якімі вельмі ганарыліся і насілі ўвесь час з сабою (памежная зона, 20 км да Літвы!). Правілы паводзінаў у летніку даволі строгія: алькаголю «на тэрыторыі» не спажываць, не брыдкасловіць, пасьля 0.00 не шумець. Вечары каля вогнішча — найлепшая магчымасьць прадэманстраваць свае ўмельствы. Нехта паказвае прыёмы кунг-фу, нехта хваліцца веданьнем турэцкай мовы, а аднойчы, у рабінавую ноч, тры гадзіны мы ў полі вучыліся танчыць «таўкачыкі» — наймэтафізычнейшы танец з усіх, якія я бачыла, — ізноў пад тую ж дуду.

Зь першага дня ўсе былі апантаныя ідэяй пераначаваць у «вежы прывідаў», каб пабачыць Белую Панну. Пашанцавала толькі першым. Дзяўчаты сапраўды пабачылі прывід. Як выявілася, гэта быў... адзін з рэстаўратараў царквы, які хацеў спраўдзіць іх чаканьні. Але дзяўчаты так спалохаліся, што натаўклі «прывіду» карак. А пасьля мы ўласнаручна зафарбавалі ў пакоі зданяў (ён жа кабінэт дырэктаркі) падлогу, затынкавалі сьцены і столь. Начаваць там больш не было як.

Увесь вольны ад працы час бавім у бары насупраць касьцёлу. Праз некалькі дзён да нас прызвычайваюцца як да неад'емнай часткі мясцовага пэйзажу. І цяпер ужо ў нас запытваюцца, ці ёсьць хто ў касьцёле, ці даюць пэнсію, ці прывезьлі квас зь Ліды. Бар «Замак»: дызайн ня горшы, чым у любым такім на захад ад дзяржаўнае мяжы (на сьценах старыя прасы, кудзеля, прасьніцы). Працуе да 2-й гадзіны ночы. Наплыў наведнікаў такі, што любы менскі бар мог бы пазайздросьціць (чамусьці асабліва актыўна мясцовая моладзь адзначала дзень пажарніка). Тут нашмат больш прыстойных маладых людзей, чым на праспэкце Скарыны. І ўсе цьвярозыя.

Гаспадыня кавярні цяпер рамантуе пад гатэль былыя гандлёвыя рады. Мяркуючы з таго, як пастаўлена справа ў «Замку», — непаганы будзе й гатэль.

Гальшанская архітэктурная славутасьць ужо нашага часу — «дом мытніка»: пабудаваны з эўраматэрыялаў, на даху «талерка», двор выкладзены пліткай акуратней, чым плошча Незалежнасьці ў Менску, перад домам гаёк, елачкі... Жыве беларускі мытнік. Сапраўдны.

Натальля Мяцельская, фізык паводле адукацыі і экскурсавод паводле пакліканьня, выкупіла ў былым жыдоўскім квартале Гальшанаў дамок, што сем гадоў стаяў пусты. Яна марыць ператварыць яго ў нешта накшталт салёну. «Гэта будзе прыватны дом, дзе любы зможа знайсьці прытулак, зайсьці на кубачак кавы. Я хачу, каб гэта былі абсалютна прыватныя бяседы. Можа быць, зь іх народзіцца нешта — нейкі тэатрык альбо штосьці іншае. Хай бы ў нас быў такі мястачковы клюб!»

Цагляны жыдоўскі квартал захаваўся цалкам толькі дзякуючы таму, што людзі ня маюць грошай, каб выкупляць дамы і перабудоўваць. Хаты ня дужа старыя: 30-я гады XX ст. Раней квартал быў драўляны, пакуль добра арганізаваная жыдоўская грамада не застрахавала яго. У адзін цудоўны дзень на ўсёй вуліцы здарыўся пажар... На атрыманую страхоўку збудавалі цаглянае жытло — ды якое! Ніводнага фасаду няма аднолькавага. Яшчэ і цяпер гэта ці не найлепшыя будынкі ў вёсцы. Перад вайною ў Гальшанах працавала габрэйская бібліятэка, дзьве габрэйскія школы — для хлопчыкаў і для дзяўчынак. Цяпер жыдоўскія клады на выезьдзе зь вёскі закінутыя, вакол сьмецьце.

На сьцяне аднаго з дамкоў кварталу — надпіс па-нямецку «Ausfahrt». Мы дзівімся — няўжо з вайны?! Выяўляецца, тут рэгулярна здымаюць партызанскія блякбастэры. І яшчэ адну сустрэчу з мастацтвам кіно падарылі нам Гальшаны: «Тэрмінатар-3» прыйшоў сюды раней, чым у Менск. За 350 руб. асалода нашмат большая, чым ад таго ж відовішча ў сталічным «Кастрычніку»: у залі зь невялічкім экранам фільм дэманструецца зь відэапраектара. Кожны, хто заходзіць у залю пасьля пачатку сэансу, уключае сьвятло, шукае вольнае месца, выключае сьвятло. Пры гэтым гук абрываецца і фільм даводзіцца пачынаць спачатку. Такое вось паўстаньне машынаў пагальшанску.

**Вераніка Дзядок, Гальшаны—Менск, фота аўтаркі**

# Саколкі

**Калі чалавек чапляе на сябе якісьці значак, гэта пра нешта сьведчыць. Асоба падкрэсьлівае такім чынам сваю індывідуальнасьць, маніфэстуе погляды й сыгналізуе сваім аднадумцам.**

Здаецца, тое ж мусіла б назірацца і ў адзеньні, прыкладам на майках (саколках). Пагатоў некаторыя саколкі ўтрымліваюць тэксту, якога хапіла б для якой малатыражкі.

Значная частка *насаколкавай эпіграфікі* — чыстая бязглуздзіца ў спалучэньні з эротыка-парнаграфічнымі матывамі. «Kochaj mnie!» — мела аднаклясьніца на сваёй дарагацэннай польскай саколцы. Тэма па-ранейшаму модная. Нехта з малой доляй сьціпласьці рэклямуе сябе як *сэкс-дзяўчынку*. Іншая папярэджвае ўсіх і кожнага, што яна іскрыстая *дзеванька-вар'ятка*. Яшчэ адна паўстае доблеснай жаўнеркай *сэксуальнага войска*. Хтось на поўныя грудзі абвяшчае пра кіпучы-магучы *дух сэксуальнага антаганізму*. Сьмешныя ж малалетачкі, накарміўшы манкай сваіх лялек і гары потэраў, пачынаюць марыць пра *чакалядныя цукеркі з каханьнем*. Ось цо да!

Зрэшты, часьцяком прыкмячаеш і *дзяўчат ледзянога каханьня*. Што за яно, ня ведаю. Зьяўляюцца цьмяныя алюзіі на Кім Бэсынджэр, Шэран Стоўн, гомельскую фабрыку марозіва і куляшоўскага хлапца, што мужна трымаўся на дапросе. А можа, яны намякаюць на прымавачку з збораў Міхала Федароўскага: «Адна дзяўчына сем хлапцоў сагрэе на ляду»? Зрэшты, і гэта ўсё блякне перад «*Я ❤ мяне!*».

У каханьні да самога сябе, як сказаў бы Самсон Самасуй, галоўнае — не апасьці ў рэўнасьць. Інакш будзе ў цябе *хворае разьбітае сэрца*. Як жа да такога органа станеш прыслухоўвацца?! А да апошняга заклікаюць носьбіткі наступнай дужа апрычонай ідэалёгіі. «*Худзей сам, здраднік*!» — зьвяртаюцца гэныя пампушкі, мабыць, да якога-небудзь дылера гербалайфу, а потым падбадзёрваюць зацятых таўстуноў: «*Слухайся свайго сэрца*». Але гіт саколкавага сэзону — вялікае неперакладабэльнае *MONDIGO* ў спалучэньні з маленечкімі перакладабэльнымі эпітэтамі *beautiful, sweet, dreem's*. Яшчэ вельмі папулярна напінаць на сябе саколкі з ангельскім надпісам *«Буйвал»*. Да таго ж вызначаюцца гэтым як дзецюкі, гэтак і паненкі. Цікава, а ці добра куплялася б апранашка з словамі *«experimental pig-breeding complex»* (экспэрымэнтальны камбікорм для парсюкоў)? Пікантна выглядаюць і саколкі з надпісам *«кельцкая культура»* на пэнсіянэрках, якія з сваімі незьлічонымі кайстрамі-клункамі-каляскамі штурмуюць аўтобусы. Нават псэўдапанкі з банальным *«панк не памёр»* ня йдуць тут ні ў якае параўнаньне. «*New human way*» — новы чалавечы шлях, цьвердзяць адмыслоўцы. І памыляюцца.

**Сяргей Балахонаў, Гомель**





IREX-PROMEDIA

# Маці-Беларусь вучыла, Растоў-тата корміць

**Працяг са старонак 1, 11.**

тэз французскай і нашай культуры». «Нашай» — то бок расейскай. Выглядала так, як нібыта маэстра нават думкі ня можа дапусьціць, што ў беларусаў свая культура і што ў вайне 1812 году ня ўсе яны былі на баку цара. Трэба аддаць належнае таленту Анісімава: вобраз Імпэрыі атрымаўся ў яго магутным, страшным і незвычайна прыгожым — як распусьніца бабілёнская. А вось у музыцы чалавечнай і цёплай — як, прыкладам, антракт з опэры Бізэ «Кармэн» — маэстра відавочна не хапае сэрца. Ён дырыгуе «энэргетыкай», а не душой; захапляе, а не кранае; танчыць, калі трэба сьпяваць.

І гэта вельмі невыгодна адрозьнівае яго ад Андрэя Галанава, які праз некалькі дзён кіраваў канцэртам у гонар закрыцьця сэзону. За часы свайго побыту ў Растове ён набыў упэўненасьць, якой раней яму не ставала. У ягонай працы спалучыліся якасьці, здавалася б, несумяшчальныя: вольная стыхія эмоцыяў і дысцыпліна розуму, які прадбачыць і кантралюе ўвесь ход музычных падзеяў; самавыяўленьне і пачуцьцё меры; душэўная адкрытасьць і арыстакратычная стрыманасьць. Наша культура шмат выйграла ад таго, што Анісімаў зьехаў у Растоў, а Галанаў адтуль вярнуўся.

# Арлоў і Глёбус у Ліцэі

**Працягваюцца культурніцкія акцыі салідарнасьці зь Беларускім ліцэем.** У аўторак, 12 жніўня, у яго будынку (вул.Кірава, 21) адбудзецца прэзэнтацыя новай кніжкі Ўладзімера Арлова «Адкусі галаву вароне», чарговага тому з сэрыі «Вострая Брама» віленскага выдавецтва «Наша Ніва». Можна будзе ўзяць аўтограф у жывога аўтара, паслухаць ня менш жывых Зьмітра Бартосіка і Адама Глёбуса. Запрашаюцца ліцэісты, бацькі, пэдагогі, абаронцы і ліквідатары Гуманітарнага ліцэю, а таксама ўсе ахвотныя. Пачатак а 18-й. Уваход вольны. Выхад таксама.



# Канцэрт году



**Выступленьне ў Менску 12 жніўня сапраўднай легенды сусьветнага року Робэрта Планта і ягонай каманды «Strange Sensation» мае ўсе шанцы зрабіцца галоўнай музычнай падзеяй году. І ня проста таму, што мае выступіць насамрэч знакаміты выканаўца, а таму, што Робэрт Плант з таго роду рокавых «дыназаўраў», якія й дагэтуль неаспрэчна ўплываюць на разьвіцьцё сусьветнай рок-музыкі.**

У апошнія гады часта здаралася, калі да нас прыяжджалі групы з гучнымі назвамі, якія напавер выяўляліся бляклымі ценямі таго, што «раньш было». Дастаткова згадаць хоць бы канцэрты «The Animals» і «Slade». Першыя ні на што не прэтэндавалі, выконваючы тую музыку, якая прынесла ім вядомасьць. З гэтай прычыны выступ гэтых музыкаў выглядаў цалкам натуральна, што цяжка сказаць пра «Slade». Магутная вечназялёная блюзавая традыцыя «The Animals» чытаецца й цяпер як рокавая клясыка, у той час як больш «навамодная» музыка «Slade» на фоне амаль поўнай адсутнасьці выканаўцаў арыгінальнага складу ўспрымалася ўсяго толькі як гучаньне запіленага вінілу з калекцыі рокера перадпэнсійных гадоў. Выпрабаваньне часам, на жаль, вытрымліваюць ня ўсе.

Такога нельга сказаць пра Планта. Ужо хоць бы таму, што гэты музыкант пасьля сканчэньня залатога веку «Led Zeppelin» ніколі не спыняўся, працягваў выступаць, рыхтаваць новыя творы, запісваць чарговыя альбомы. Ён проста ня мог існаваць па-за межамі выбранага некалі бурлівага ладу жыцьця. Ён не эксплюатаваў бясконца створанага разам з «цэпэлінаўскімі» калегамі, не жыраваў на заслугах былога, а ўвесь час імкнуўся прыдумаць нешта новае, зводзячы тым самым у адно традыцыі яшчэ з канца 60-х і тое новае, што зьяўлялася ў папулярнай музыцы ў апошнія гады.

У 1980 г. ён выбраўся на ўласны шлях. І ўжо праз два гады першыя запісы ягонага гурту засьведчылі, што да «цэпэлінаўскай» традыцыі ён далучыў модныя ў той час электронныя тэхналёгіі, адначасова выказваючы вялікую зацікаўленасьць музычнай культурай краінаў Усходу. Ня рваў ён сувязі з былым сваім калегам Джымі Пэйджам, хоць гэтае супрацоўніцтва было эпізадычным. Таму што гледачы, калі бачылі на авансцэне гэтую пару, патрабавалі найперш «цэпэлінаўскі» рэпэртуар. Аднак Плант не дазваляе сабе парازітаваць на тым, што засталося ў далёкім мінулым і гучала ўжо сотні разоў. Вось чаму ў пары з Пэйджам ён заўсёды імкнуўся выконваць залатыя гіты мінулага хоць трошкі па-новаму. Тое, што было, як кажа сам Плант, нікуды ня дзенецца, а таму галоўная задача — рабіць новае. Вось чаму ён безь вялікага энтузіязму адгукаецца на вызначэньне «былы вакаліст «Led Zeppelin». Яму больш даспадобы, калі яго называюць Робэртам Плантам. Проста Плантам.

Ён на працягу некалькіх гадоў фармаваў новы склад свайго калектыву, якому даў назву «Strange Sensation». Зь ім і запісаў альбом «Dreamland». Магчыма, гэта быў галоўны праект, да якога Плант імкнуўся праз усе апошнія гады. Ён быццам бы вырашыў прывесьці слухачоў у чарадзейную краіну, у якой арганічна пачуваюцца як ён сам, так і тая музыка, на аснове якой ён склаўся як вялікі музыкант. Аўтарскіх твораў у альбоме менш, чым кавэраў, прычым з даволі салідным векам. Аднак увесь гэты матэрыял Плант прапусьціў праз уласную творчую «мясарэзку» і вырабіў такую смачную, ледзь ня пальцам пханую, кілбаску, у параўнаньні зь якой прадукт якіх-небудзь «Сьлівак» ды іншых вяршкоў нібыта музыкі выглядае ні на што ня здатным харчовым дадаткам, які складаецца выключна із штучных замяняльнікаў.

У «Краіне мары» ёсьць творы, якія стылёва належаць да досыць узаемаадлеглых стыляў: кантры, блюз, рок-н-рол. Але музыкі групы на чале з Плантам насыцілі гэтыя творы элемэнтамі электронікі, арыентальнымі матывамі і нават мадальным джазам. У выніку паўстаў арыгінальны прадукт, смачны і прыцягальны, якому наўрад ці пагражае абмежаванасьць тэрміну захоўваньня. Гэта не музычныя кансэрвы, здольныя пратрымацца, не пускаючы смуроду, сэзон-другі. І адначасова гэта — ня музыка для дыскатэкі. Таму для тых, хто чакае ад канцэрта ўсяго толькі пацехі, ісьці слухаць гэтых клясных музыкаў ня раю. Піце лепш «Колу». А для тых, хто здольны адчуць розьніцу паміж ліпкай слодычай і смакам сапраўднага піва, паўстае ўнікальны шанец пераканацца, што на сьвеце існуюць музыка і музычка. І калі апошнюю трэба ўсяго толькі бяздумна спажываць, музыку трэба ўмець слухаць. Што ня так проста нават у дачыненьні да року.

Ужо хоць бы таму, што пачынаць рабіць гэта варта было б з 1968 году, калі ўпершыню прарэзаўся магутны і неўміручы голас «Led Zeppelin»…

**Дзьмітры Падбярэскі**

## ДЫСКАГРАФІЯ




## ГУСЬЛЯР

**Ансамбль «Песьняры».** (р) 2000 «Boheme Music».

Ня трэба зьдзіўляцца, што гэты альбом, перавыдадзены яшчэ ў 2000 г., толькі цяпер патрапіў пад разгляд. Гэтае перавыданьне суправаджаецца шэрагам момантаў, невядомых шырокай публіцы.

Па-першае, «Boheme Music» — гэта маскоўская фірма, якая спэцыялізуецца на выданьні дыскаў з запісамі сучаснага джазу постсавецкае прасторы (на ёй запісваліся і нашыя «Apple Tea»), а таксама твораў сучасных кампазытараў-акадэмістаў. «Гусьляр» — пэўнае адступленьне ад правілаў. Але невыпадковае.

Па-другое, амаль увесь наклад альбому пайшоў у краіны Эўропы. А на адным з музычных сайтаў ён названы сярод дваццаці найлепшых альбомаў прагрэсіў-року ў сьвеце. Вось чаму перавыдадзены быў гэты альбом з пазнакай «progressive» на вокладцы і праз дваццаць гадоў пасьля першага выданьня зрабіўся ў Эўропе запатрабаваным прадуктам. А аўтар музыкі Ігар Лучанок — адным з самых прагрэсіўных рок-кампазытараў сьвету. Во як!

Амаль цалкам прысьвечаны «Гусьляру» і артыкул пра «Песьняроў» у інтэрнэтаўскай «Гібралтарскай рок-энцыкляпэдыі». Там праводзяцца ўжо зусім нечаканыя паралелі між «Гусьляром» і падобнымі творамі Фрэнка Запы, альбомамі «Journey to the Center of the Earth» Рыка Ўэйкмана і «Days of Future Passed» гурту «The Moody Blues», а гучаньне духавой сэкцыі параўноўваецца з тым, што рабіла група «Chicago». Такі збор фактаў прымусіць яшчэ раз уважліва праслухаць «Гусьляра» і прызнаць відавочнае: «Песьняры», калі б мелі магчымасьць сапраўднай «раскруткі» за мяжой, рэальна маглі б зрабіць тую кар'еру, якой заслугоўвалі.

**Уражаны СЛУХАЧ**

## СЬВЯТОЧНЫ

**Група «Палац».** (р) 2003 «Aist Music».

«Сьвяточны» і сапраўды надае слухачу найлепшы настрой. Асабліва таму слухачу, які пра «Палац» дагэтуль мае даволі цьмянае ўяўленьне.

Тут сабраныя песьні, запісаныя ў розныя гады, ад «Канюшні» і да напісанай нядаўна Алегам Хаменкам на аснове купальскіх песень «У лузе». Выпадковым элемэнтам падалася мне беларускамоўная вэрсія славутай і «ідэалягічна чужой» нам песенькі «Jingle Bells». Ці то аранжываньне ня надта ўдалае, ці то з тэмпам перабор, але песьня тая неяк выпадае з агульнай праграмы. Дарэчы, згаданая ўжо «Ў лузе», а таксама «Васілейка» анансуюць новы альбом «Палацу», які мае выйсьці налета.




**Сьвяточны СЛУХАЧ**

## ДИАГНОЗ

**Аляксей Шадзько і група «Сястра».** (р) 2003 аўтарскае выданьне




Паставіць дыягназ таму, што зроблена ў альбоме, ня так і проста. На першы погляд гэта, як падалося пасьля неадназначнага «ўезду» ў праграму, самы невыразны з усіх альбомаў, калі-небудзь выдадзеных Шадзьком.

Альбому не стае звычайных адной-дзьвюх ударных песень зь яскравымі мэлёдыямі, якія адразу ж кладуцца на слых і ствараюць няўлоўную атмасфэру ўсяе праграмы. У «Дыягназе» на такую ролю могуць прэтэндаваць, бадай, толькі «Я сочиняю этот блюз» ды «Расстреляйте меня». Першая — дастаткова спакойны, неэкзальтаваны сапраўдны блюз, у якім блюзавая экспрэсія моцна прыціснутая сэнсам песьні (не на шкоду апошняму). Другая вызначаецца, як і ўвесь альбом, магутнай рокавай экспрэсіяй. Але агульнай аздобаю і выразнасьцю не дацягвае да найлепшых узораў.

Тут у Аляксея, як ніколі раней, моцна адчуваецца знаракавая, у бок рок-стылістыкі, мадуляцыя голасу. Часам аж да яўнага перабору («За горизонт...», «Когда все лягут спать»). Голас, амаль зрываючыся на крык, губляе прыцягальнасьць і робіцца падобным на голас неадукаваных «рок-мэсіяў», што вучыліся выключна на іншаземных відэаролiках.

Разам з тым, альбом гэты ў чарговы раз прадэманстраваў выключнае майстэрства «Сёстраў», іх узорную ансамблевасьць. Дый запіс, як заўсёды ў Шадзька, — рэдкай для Беларусі якасьці.

І ўсё ж — ці не пасьпяшаўся гэтым разам Аляксей? Не пагаджуся з тымі, хто пасьпеў ужо перакінуць назву альбому на далейшы творчы лёс музыканта. Ад Шадзька можна чакаць усяго, а ад бальшыні музыкаў нельга патрабаваць, каб кожная новая іх праграма была абавязкова лепшая за папярэднюю. І тым больш нельга навязваць ім нейкія рэцэпты, якія, магчыма, ужо і вам асабіста не дапамагаюць...

**Лятальны СЛУХАЧ**

Тэрмінатар—3

# Чацьвертага канца сьвету ня будзе

**Цягам дванаццаці гадоў ніхто не наважваўся здымаць трэці фільм пра прыгоды амэрыканскіх Электронікаў-пераросткаў з будучыні, і вось — здарылася.**

Гэтым разам маральна састарэламу жалезнаму Арні даручана абараніць выратавальніка чалавецтва Джона Конара ад бязьлітаснай машыны Т-Х, якую ўвасабляе прыгажуня Крысьціяна Локен. «Тэрмінатар-3» — гэта шэраг пагоняў, гумар жалезнага абаронцы, пранізьлівыя вочы Конара ў моманты самаахвяраваньня... У адным з інтэрвію Шварцэнэгер прызнаўся, што атрымлівае найбольшую асалоду ад эпізоду, калі яму даводзіцца мачаць Крысьціяну-Т-Х галавою ва ўнітаз.

Тры «Тэрмінатары» ўтвараюць сапраўдную кінаэпапею. Маштаб яе дзеі можна параўнаць хіба з «Зорнымі войнамі». Толькі Джордж Лукас ствараў прыгожыя фантастычныя казкі, а Джэймз Кэмэран — фільмы пра блізкую будучыню. Дзея трэцяй часткі перапыняецца ў 2004-м, калі супэркамп'ютар «SkyNet» пачынае вайну. Хіба складана ўявіць, што гісторыі наканавана разьвівацца паводле Кемэрана? Кажуць, робаты ўжо гуляюць паміж сабой у футбол...

Трэці «Тэрмінатар» у сэнсавай насычанасьці значна саступае двум папярэдлім. Яго сюжэт адрозьніваецца ад сюжэту другога фільму толькі нязначнымі дэталямі. На добры лад, «Тэрмінатар-3», зьняты Джонатанам Мастоў, — гэта ня больш чым яксны баявік, за якім цягнецца філязофскі хвост Кемэранавых стужак. Калі «Тэрмінатар-2» стаўся выключэньнем з кінэматаграфічнага правіла, згодна зь якім кожны працяг горшы за папярэдні фільм, дык «Тэрмінатар-3» пацьвярджае той закон на ўсе сто.

**Павал Сьвярдлоў**



БІБЛІЯТЭКА

# Тры істотныя адрозьненьні

Алесь Гарун. Выбраныя творы. — Менск: «Беларускі кнігазбор», 2003.



Калі лічыць па-старому, тузінамі, дык кніга выбраных твораў Алеся Гаруна, што днямі ўбачыла сьвет, — юбілейная, бо 24-я ў сэрыі. Зноў жа, ад папярэдняга, больш поўнага зборніка Гаруновых твораў «Сэрцам пачуты звон» яе аддзяляе дванаццаць гадоў. Тая кніжка выйшла за савецкім рэжымам, амаль праз чатыры гады пасьля «ідэалягічнае дывэрсіі». У 1987 г. ЦК КПБ забараніў хоць нейк ушанаваць 100-ю гадавіну з дня нараджэньня паэты, які быў сябрам Рады БНР, сутворцам Акту 25 Сакавіка і кіраўніком Беларускае Вайсковае Камісіі (БВК). І вось у «Литературной газете» зьяўляецца юбілейны артыкул Вячаслава Рагойшы... У Менску быў эфэкт эксплёзіі. Ідэалягічная служба мітусілася, інтэлігенцыя ж радавалася. Так пачаўся рэнэсанс Алеся Гаруна — паэты, празаіка, публіцыста, грамадзкага і палітычнага дзеяча.

Калі параўноўваць новую кнігу А.Гаруна са зборнікам «Сэрцам пачуты звон», дык трапляецца на вочы першае істотнае адрозьненьне: у ёй ёсьць Дадатак, у які падуключаныя ўспаміны пра А.Гаруна, напісаныя Антонам Аўсянікам, Міколам Шулам, Францішкам Кушалем і невядомым нам А.Эсонам.

Дарэчы, у камэнтарох да ўспамінаў А.Аўсяніка укладальнік кнігі і аўтар прадмовы да яе Ўладзімер Казьбярук аспрэчвае цьверджаньне, што А.Гарун стаяў на чале БВК. Ён піша, што гэтую інстытуцыю ўзначальваў Павал Аляксюк і што Гарун быў адно чальцом яе. Паверым усё ж сябру Рады і Ўраду БНР, сябру БВК Аўсяніку. І спашлемся на прэм'ер-міністра БНР Антона Луцкевіча, які пісаў: калі Аляксюк «растраціў» дараваныя яму грошы і вымушаны быў пайсьці з БВК, яго месца заняў Гарун. А старшынёўскае месца Гаруна ў Часовым Беларускім Нацыянальным Камітэце ў Менску заняў міністар Кузьма Цярэшчанка.

Паміж кнігамі маецца і другое істотнае адрозьненьне. Калі ў першым разьдзеле даўнейшага выданьня ўзнаўляўся прыжыцьцёвы зборнік Гаруна «Матчын дар» (1918), а потым друкаваліся вершы, што ў яго не ўвайшлі, дык у новым зборніку ўсе паэтычныя тэксты друкуюцца паводле храналягічнага прынцыпу (твор «Дні» перанесены ў разьдзел «Апавяданьні»).

Ёсьць паміж дзьвюма кнігамі й прыватныя адрозьненьні. Не кажу, што прапушчаныя тры чарнавыя накіды вершаў А.Гаруна і цыдулка да бліжэй не вядомага Тарасіка (праўдападобна, да Тараса — Браніслава Тарашкевіча). Верш «***Чаму з маленства, зураджэнства...», надрукаваны пад гэткім загалоўкам у «Матчыным дары» і ў кнізе «Сэрцам пачуты звон», у кнігазбораўскім выданьні атрымаў, як і ў першапублікацыі ў «Нашай Ніве», назву «Роднаму краю». Ня ведаю, наколькі гэта стасуецца з воляю аўтара, які загаловак «Роднаму краю» перанёс на разьдзел у «Матчыным дары», а сам верш пазначыў трыма зорачкамі. У падобны спосаб укладальнік абышоўся і зь вершам «***Мілая, родная старонкамаці!..»: рэанімаваў нашаніўскую рэдакцыю (з загалоўкам «Маці-Беларусі»), а варыянт дзьвюх строфаў, зроблены паэтам для «Матчынага дару», перанёс у камэнтары. Нашаніўская рэдакцыя мне падабаецца больш, але як такое абыходжаньне з тэкстам стасуецца з навуковасьцю? Ці не парушаецца тут воля аўтара?

Засяродзіўшыся на прыватнасьцях, ледзь не забыў зьвярнуць увагу чытача на трэцяе істотнае адрозьненьне. На пачатку 1991 г. ідэалягічны гнёт нагэтульки стаў лёгкі, што У.Казьбярук здолеў уключыць у «Сэрцам пачуты звон» бадай усё, напісанае А.Гаруном. Акрамя добрага тузіна ягоных артыкулаў, друкаваных у газэце «Беларускі шлях» (1918), якую паэта рэдагаваў. У кнігазбораўскім томе апублікаваныя і тыя артыкулы.

**Анатоль Сідарэвіч**

ТЭАТАР

# Фэстываль стадольных тэатраў

Спэктаклі ў стадолах пачалі масава граць на хвалі нацыянальнага адраджэньня. Літоўцы — з канца XIX ст., беларуская трупа Буйніцкага — на пачатку XX ст. Народныя тэатры на вёсках ладзілі паказы ў стадолах, бо іншых вялікіх памяшканьняў, дзе зьмясьціліся б і сцэна, і гледачы, не было. У Беларусі традыцыя занядбаная, хоць нейкія маладыя антрэпрызы ці напаўлегальная трупа Мазынскага маглі б жыва выкарыстоўваць стары досьвед, паказваючы якія «Залёты» ці «Камэдыю». Бо вось на памежнай польска-літоўскай Сэйненшчыне гэты тэатральны рух адноўлены.

Першы стадольны спэктакль тамака адбыўся ў 1906 г. Праз колькі гадоў палова вёсак у Сэйненскім, Пунскім і Шыплiскім паветах мелі свае тэатры.

Спэктаклі рыхтаваліся тады, калі скончаліся палявыя работы, — увосень ці ўзімку. Сам тэатральны сэзон пачынаўся пры канцы траўня і доўжыўся блізу месяца. Спэктаклі адбываліся раз у тыдзень. Паказаўшы прэм'еру ў роднай вёсцы, акторы складалі строі ды рэквізыт на фурманку і выяжджалі ў турнэ па вакольных вёсках. Зь візытамі ў адказ прыяжджалі акторскія калектывы ад суседзяў.

Скончыліся гэтыя спэктаклі з пачаткам другой сусьветнай вайны й прыходам камуністаў: савецкія ўлады зьнішчылі калектывы, якія дзейнічалі на тэрыторыі Літвы. Традыцыя стадольных тэатраў засталася толькі на тэрыторыі Польшчы: яшчэ ў 1970-х у многіх вёсках вакол Сэйнаў і Пунску літоўскія сяляне ставілі спэктаклі. У 80-я рух амаль занапаў. Яго рэанімавала Юрата Кардоўская, кіраўнічка Літоўскага дому культуры, якая здзіла фэстываль стадольных тэатраў. У рэпэртуары пераважаюць літоўская клясыка і вясковыя камэдыі.

На сёлетнім фэстывалі прысутнічалі й гледачы зь Беларусі.

**Актор**

ПРА-БЕЛ

# Каб паважаць сябе

У дэмакратычных газэтах звыкла лаюць бальшавізм, сьпісваючы на яго праблемы сёньняшняга дня. Часам можна пачуць, што народ наскрозь праела, нібы пранцы, камуністычная ідэалёгія. Маўляў, таму й Лукашэнку маем, таму й праблемы з дэмакратыяй.

Гэтак усё проста сабе патлумачыць.

Скаргі зацятых антыкамуністаў — нібыта нейкае апраўданьне. Апраўдваемся і апраўдваемся. Самі перад сабой.

Ніякага сацыялізму-камунізму ў Беларусі цяпер ужо проста ня можа быць. Бо гэта вельмі дарагое задавальненьне. Такі рэжым зашмат каштуе. Асабліва пры сёньняшніх стандартах жыцьця.

Штогод назіраю, як усё чысьцейшай робіцца рэчка Палата. Няўжо гэта вынік працы мясцовай экалягічнай службы? Зусім не. Проста забруджваць навакольнае асяродзьдзе з кожным годам робіцца ўсё складаней. Дзе ўзяць тую мазуту, якую трэба зьліць у раку? Дзе ўзяць пэстыцыды? Дый ручаі фэкаліяў з фэрмаў плычэць проста на вачах. З прыродай цяжка спаборнічаць, бо яна мае пэрпэтуум-мобіле. Ёй ня трэба выпрошваць у банку крэдыты пад пасяўную.

Бадай, усе народы й краіны ў сваёй гісторыі мелі ня вельмі прыемныя пэрыяды. Гісторыю нельга абвінавачваць, гэтаксама як нельга перажыць тыя гады наноў.



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

І яшчэ. Мы не зусім пасьлядоўныя. Любім казаць: калі б не было БНР, не было б РБ. Аднак праўда яшчэ ў тым, што калі б не было БССР, дык таксама не было б РБ. Гэтае зьвяно беларускага ланцуга нікуды ня выкінеш.

Больш таго. Нацыянал-камунізм мы мусім разглядаць як пэўны досьвед нацыянальнага сьветаўладкаваньня. Няхай сабе й адмоўны досьвед, але свой уласны. І зусім ня маем падставаў ганіць мастацкія творы адно за камуністычны зьмест. Тут наперадзе павінна быць эстэтыка, а не палітыка. Мае рацыю літаратурны крытык Пятро Васючэнка, які называе асобныя тэксты, напісаныя за савецкім часам, мадэрнісцкімі. І зусім ня меў рацыі Міхась Скобла, які не ўключыў у анталёгію беларускай паэзіі XX стагодзьдзя твораў Паўлюка Шукайлы — найбольш яскравага прадстаўніка беларускага мадэрнізму 20-х гадоў.

Сёлета Беларусь адзначае 80-годзьдзе літаратурнага аб'яднаньня «Маладняк». Гэта адметная старонка беларускай культуры. Мне асабіста «Маладняк» нагадвае «Тутэйшых». Большасьць маладняўкоўцаў былі аддані патрыётамі сваёй Бацькаўшчыны. І сёлета варта нам іх удзячна згадаць. Таварыства Вольных Літаратараў выступіла з прапановай да Полацкага гарвыканкаму ўшанаваць памяць тых паэтаў і празаікаў, якія стварылі адну зь першых беларускамоўных газэт Прыдзьвіньня, «Чырвоную Полаччыну», і працавалі ў ёй, зрабіўшы пэрыядык цэнтрам літаратурнага жыцьця Полацку 20-х гадоў. Гэта і Алесь Дудар, і Алесь Звонак, і Валеры Маракоў, і Пятрусь Броўка, і Эдуард Самуйлёнак. Усе яны былі маладнякоўцамі. Большасьць патрапіла неўзабаве пад рэпрэсіі. Тэвэлаўцы прапанавалі ўсталяваць памятную дошку на будынку, у якім месьцілася рэдакцыя газэты. І гэта будзе знак павагі да саміх сябе.

**Алесь Козік, Полацак**

# З запазухі

Рыгор Барадулін

**Працяг. Пачатак у «НН» № 19, 21, 23, 26.**

## Няхай цісьнецца...

Ня раз разважала Марушка, як знайсьці выйсьце з галечы.

...Калі чалавек абядннеіць, няхай цісьнецца к лесу ці к возеру: у лесе лыка надзярэць, у возеры рыбіну зловіць і неяк пераб'ецца...

Само спракавечча прамаўляла. А лясы безь лясінаў, азёры бяз рыбы. Чалавек так цісную́ся да іх, што ўсё расьціснуў...

## Такой і бараніўся...

Зь не такой і далёкай даўніны дайшла вясёлая быліца.

Малады ксёндз (нібыта Чырвонага касьцёлу, што ў Менску) надта ўжо ласы быў на парафіянак.

Справа дайшла да вярхоўнікаў. Судзяць яго, значыцца. Усе грахі пералічваюць. Яшчэ кропля — і пазбавяць сану. Даюць апошняе слова.

Ксёндз і прызнаецца:

— Яны ўсе на мяне пруць. А я якую зброю меў, такой і бараніўся...

Шчырасьць і нечаканасьць патушыла гнеў вярхоўнікаў. Маладога самаабаронцу перавялі ў маленькую далёкую парафію.

## Адпаведнасьць

Перакладаю «Put, veini!» Яна Райніса. Увесь час лезу ў слоўнік. Раптам у вочы кідаецца слова «bende», і яно перакладаецца толькі як «кат», ці па-расійску «палач». Ніякага іншага значэньня.

І сапраўды, Лукаш Бэндэ быў катам. У змрочныя гады сталінскага тэрору пашчырэў-такі. Разгромныя артыкулы, адпаведныя характарыстыкі ў органы, вобыскі ў жывых клясыкаў.

І здарылася так, што ў выдавецтва недзе ў шасьцідзясятых гадах зайшоў невысокі, невыразны, да бліскаты лысы нехта. Падае мёртвую й ліпкую руку:

— Бэндэ.

І мне стала зябка. Была яшчэ цёмная восеньская раніца. У пакоі я быў адзін. Лямпачкі гарэлі болей чым ашчадна. Ажылі ўзгадкі і ацалелых, і рэабілітаваных пісьменнікаў нашых.

Гэты нехта на ймя Бэндэ нешта казаў, нешта прапаноўваў выдавецтву выдаць. Я ня чуў. Адаслаў яго да начальства. І з маладой бязьлітаснасьцю напісаў:

— Die Stunde ist zuende,
Ня ўсё зрабіў, што мог, —
Сказаў са злосьцю Бэндэ
І ў дамавіну лёг.

## І нецікавае цікава

Усёдапытлівы Віталь Скалабан (у нас пра спрытных казалі: ён з-пад сучкі яйцы ўкрадзець) удакладніў. Сапраўднае прозьвішча Бэндэ — Бонда. Гэта бочка ці цэбар (для Бэндэ лепей падыходзіць цэбар з памыямі).

А Вячаслаў Шыдлоўскі ў сваіх узгадках у кнізе «Рысы майго пакаленьня» піша, што Лука (пра асацыяцыі з гэтым імем нанач ня трэба нават думаць, каб не сасьнілася штосьці) для псэўданіму выкарыстаў пачатковыя літары ад словаў «Бей национал-демократов».

Вядома, ня ведаў паслугач Лубянкі, што ў латыскай мове bende — кат.

Яно й праўда, Бог шэльму меціць!

## Хапіла...

Кастрычніцкі пераварот, думаецца, ня гэтулькі абудзіў масы (выраз савецкай ідэалёгіі), як узьняў з дна ўсё, што вякамі асядала.

І пайшлі касякамі пралетарскія паэты, чырвоныя прафсаары.

Успплыў і паэта Паўлюк Шукайла. Пачынаў кар'еру як камсамольскі бос у Полацку.

Тарас Хадкевіч распавядаў. Заходзіць ён да Шукайлы ў кабінэт. Шукайла сядзіць за шырачэзным сталом, за сьпінай камсамольскага сакратара ягоны ж партрэт ад падлогі да столі, зьлева ад партрэту Шукайлы — маленькі партрэцік Карла Маркса, справа — Фрыдрыха Энгельса. Хадкевіч зьдзівіўся:

— Паўлюк, што гэта ў цябе?

— А хіба няправільна, што вісяць партрэты правадыроў? — запытаўся гаспадар кабінэту.

Шукайла рос, рос ды і дарос ледзь не да рэктара чырвонай акадэміі мастацтва ў Ленінградзе (здаецца, так называлася супэррэвалюцыйная кузьня чырвоных кадраў).

Але ў беларускай прэсе ішлі на Шукайлу эпіграмы, давалася рэальная ацэнка ягонаму паэтычнаму таленту. Пятрусь Броўка цытаваў неяк ці то арыгінал, ці то пародыю ў стылі Шукайлы:

Выйшаў я на сенажаць
Ды з нагана жабу бац...

І раптам Шукайла зьнік. І пасьля рэабілітацыі шасьцідзясятых гадоў не чуваць было нічога пра паэта й акадэміка. А растлумачыў Пятрусь Броўка, што здарылася.

Шукайла даў тэлеграму ў Менск блізка такога зьместу: «Спыніце цкаваць паэта Паўлюка Шукайлу. Кагановіч». І тэлеграмы хапіла.

## Радзей...

Васіль Быкаў распавёў неяк пра актыўных выступоўцаў, якія любілі па лініі бюро прапаганды літаратуры йсьці ў масы.

Група маскоўскіх савецкіх пісьменнікаў пабыла ў Доме састарэлых.

Выступалі. Чыталі вершы, урыўкі з эпапеяў. Кожны ва ўступным слове казаў, як ён любіў бацькоў, як рупіўся аб іх.

Потым абед. Чабаровая гарбатка. Блінчыкі плаваюць у масьле, як тыя крыгі ў разводзьдзе. Да задаволеных, бліскучых ад абеду інжынэраў чалавечых душаў падыходзіць бабулька ды ціха просіць:

— Вы радзей да нас прыяжджайце.

— Чаму? — дзівуюцца госьці.

— Пасьля вас нас цэлы тыдзень пярлоўкай кормяць...

Нечаканы паварот сюжэту.

## Выкупіла...

У магазыне «Сталічны» пры канцы васьмідзясятых касірка выбівае чэкі. Народу з раніцы яшчэ няшмат. Каля касіркі круціцца фраер са шрамам. Касірка нарокліва кажа яму, што ў яе адны выдаткі. І між іншым, што выкупіла пяць тамоў Уладзімера Караткевіча.

## Трэба пабудаваць...

У Вушацкі музэй прыйшоў ліст з Францыі. Францускі гісторык пытаўся, ці захаваўся ў Вушачах дом, у якім начаваў Напалеон у ноч з 22-га на 23-га ліпеня 1812 г.

Безумоўна, ні дому, дзе начаваў Напалеон, ні наагул ніводнага старога будынку ў Вушачах не засталося. Што ня зьнішчыла вайна, дазьнішчылі раённыя горадабудаўнікі (так і хочацца сказаць — горабудаўнікі), панастаўляўшы цагляных карабкоў а-ля баракі з сацыялістым імпэтам, з клясавай пралетарскай нянавісьцю да ўсяго дакастрычніцкага.

І калі мне званіў у Вушачы Васіль Быкаў з Хельсынкі, я паведаміў яму, які клопат у дырэктара музэю. Парада была па-быкаўску лякънічная й нечаканая: трэба пабудаваць неадкладна...

## Лёгіка

Адзін вушацкі паехаў да радні (сястра выйшла замуж за расейца) у чарназёмную Расею. Закусь, зразумела, павёз сваю.

Колькі дзясяткаў гадоў, як скончылася вайна, а ў некалі вялікім і спраўным сяле ўсё так, як быццам вайна толькі сёньня замоўкла.

Бур'ян ды крапіва вядуць сацыялістычнае спаборніцтва, хто каго перарасьце. Няма хлеба. Плот збуцьвеў, вароты дагніваюць у траве. Каб парсючок рохнуў, каб певень загаласіў.

Вушацкі й пытаецца ў швагра:

— Чаму двара не загародзіш, не паставіш варот?

— А навошта вароты ставіць, усё роўна камунізм, — чуецца адказ.

— А чаму хоць бы курэй не трымаеце?

— Дык яны ўвесь двор за...яруць. А па яйкі мы ў Маскву езьдзім, — не здаецца сваячок.

Нібыта ў Маскве за Спаскімі варотамі куры нясуцца. У кожнага свая лёгіка.

## Налівай!

Залежна ад таго, чаго на стале болей, на бяседзе гучыць адзін і той жа ласкавы прымус з розным сэнсам:

— Налівай, бо не ядзяць!

Альбо:

— Налівай, бо паядзяць!

Пра гасьцей гаспадар мусіць рупіцца канкрэтна.

## А з тваей...

Ніводнае застольле ў раёне не абыходзілася без сакратара райкаму, як да саветаў без папа сьвята.

Асабліва любілі райкамаўцы гасьцяваць у старшыняў калгасу.

Па-цяперашняму кажучы, чырвоны памешчык адзначае круглую дату свайго сужэнства. Пачынае (вядома ж, на трасянцы, якая перамагла літаратурную мову і беларускую, і расейскую ды стала як не дзяржаўнай у нас на ўсіх паверхах улады):

— З маёй жаной я пражыў двацацьць лет.

Сакратар райкаму, што яўна скончыў няхай і завочна партшколу, папраўляе ўголас:

— С моей.

Старшыня пачынае спачатку:

— З маёй жаной...

Сакратар зноў папраўляе.

І старшыня не вытрымлівае ды ўдакладняе:

— А з тваей толькі пяць...

Камуністы стараліся быць дакладнымі.



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

## Партрэт

Марушка казала пра адну маладзіцу, як каля яе мужык пахадзіў:

— Морду зьбіў мерзлай касьцiной — няма дзе курыцы дзюбнуць.

## Прыгажэйшы...

Нэгр на прыпынку таксі. Машын няма. І нейкая прыватная пад'яжджае. Тут жа ўзьнікае цыганка з цыганяткам і гвалтам цісьнецца ў машыну, яшчэ цьвелячы нэгра:

— Усё роўна ня сядзеш.

— Куды? — пытаецца прыватнік.

Цыганка нэгру:

— У, чорт!

— А ўсё роўна я прыгажэйшы, чым ты, — спакойна сказаў нэгр і ўсьміхнуўся, нібы надскіпаны дасьпелы плод.

## Не да гумару

У аднаго амбітнага пісьменьніка, які любіў пакпіць зь іншых, адабралі пасаду дэпутата Вярхоўнага Савету БССР і перадалі іншаму проза-паэту. ЦК даў свайму сымпатыку цацку панасіць дый перадаў майстру даносаў.

Навасьпечаны дэпутат звоніць яшчэ ўчорашняму дэпутату й пытаецца, на якой вышыні на ляцкане насіць ахоўны знак.

І такое нахабства ўзьюшыла таго, у каго цацку забралі. Хадзіў па рэдакцыях ды казаў, які нявыхаваны спадкаемца, якая несправядлівасьць на сьвеце. На сябе гумару не хапіла.

## На слых

Мужык кажа:

— Я сваёй бабцы судцы вады ўкінуў.

На слых чуецца, як бабцы-сучцы. (Суды — два вядры.)

## Ня ўсе дома...

Сваты ў хату, а дзяўчына ў адной сарочцы кросны тчэ.

— Чаму без сукенкі?

— Двор не абброхан.

— Дзе бацька?

— Паехаў для мяса закрасы.

— А дзе матка?

— Зь леташніх жартаў сёлета хварэіць.

Вырашылі, што сапраўды ня ўсе дома ў маладой дый завярнулі аглоблі. А яна на пытаньні як бы загадкамі адказала, сватоў на кемнасьць правярала. Усё адзначала: у двары няма сабакі, бацька паехаў па соль, маці павінна раджаць.

**Працяг будзе.**

## ТЫДЗЕНЬ У АСОБАХ

**Віцэ-прэзыдэнт Сусьветнага банку па Эўропе і Цэнтральнай Азіі Яханэс Лін** выказаў свае меркаваньні пра беларускую эканоміку. Ён верыць у нашу краіну. Беларусь, дзе Лін пабываў зь візы-



там у траўні, «вельмі цікавы выпадак». «Беларусь усё ж здолела пераарыентавацца экспарт на Эўропу», таму ў яе захоўваецца патэнцыял. Аднак «Беларусь будзе такой анамаліяй у палітыцы й эканоміцы, што я нават не магу сабе ўявіць, каб яна захавала ў сярэдне- і доўгатэрміновай перспэктыве цяперашнюю палітыку. Пачуцьці ізаляцыі, расчараваньня стануць невыноснымі». На думку Ліна, гэта змусіць краіну перагледзець падыходы да кіраваньня эканомікай.

**Натальля Трыфанава** (на здымку справа), музычны работнік дзіцячага садка зь вёскі Чачкава (Меншчына), выйграла чэмпіянат сьвету па спартовай саўне. Яе вынік — 13 хвілінаў 15 сэкундаў.

44-гадовы ксёндз **Стэфана Гардзэнья** з італьянскага мястэчка Баяна ўратаваў сямёх дзяцей, што танулі ў Адрыятычным моры, а сам загінуў. Дзеці пабеглі купацца, нягледзячы на шторм, адплылі ад берагу. Узьняліся вялікія хвалі, дзятва запанікавала, стала крычаць «ратуйце». Ксёндз, выдатны плывец і нырэц, які апекаваўся 50-цю падлеткамі зь летняга лягеру, скочыў у мора як быў, у сутане. За хвіліны ён выцягнуў усіх дзяцей, але сілы яму здрадзілі і ён сам не даплыў да берага.

Усе паведамленьні пра **сьмерць Гейдара Аліева** пасол Азэрбайджану ў Турцыі Мамед Аліеў назваў «паклёпам, накіраваным на дэстабілізацыю сытуацыі». А тых, хто распаўсюджвае «паклёп», назваў «агалцелымі мэдыятэрарыстамі», якія «павінны быць выкрыты й пакараны». Тэрмін, вынайдзены пасалом, бязумоўна, варты пераймання. Асабліва — нашымі чыноўнікамі, што апякуюцца незалежнай прэсай.



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

Людзі ствараюць тэатры: у правым крыле менскага Дому афіцэраў адкрыецца Драмтэатар беларускай арміі. Ідэя належыць **Аляксею Дудараву**. Ён плянуе, што ў тэатры будуць ставіць клясыку, а таксама нешта накшталт «канцэртаў ці агітбрыгадаў». Прэм'ернай п'есай будуць «Радавыя».

Маштабы мілітарызацыі расейскіх элітаў уражваюць. **Сацыёляг Вольга Крыштаноўская**, загадчыца сэктарам вывучэньня эліты РАН, апублікавала сэнсацыйныя вынікі свайго дасьледаваньня: на сёньня «людзі ў пагонах» складаюць 25% вышэйшага дзяржаўнага зьвяна. Сярод намміністраў, прызначаных за тры пуцінскія гады, пагоны маюць 35%. А ў апаратах фэдэральных акругаў — аж 70% выхадцаў з войска й спэцслужбаў. То ж то вайне ў Чачэніі не відаць канца.

Англіканскі пастыр **Джын Робінсан** стаў першым біскупамгеем у ЗША. Яго абралі 62 галасамі супраць 45. Біскупы-кансэрватары прадракаюць, што гэта можа выклікаць раскол у эпіскапальнай царкве, якая мае 70 млн вернікаў у 38 дзяржавах. «Пы-



таньне Робінсана» мусіла вырашаца яшчэ на тым тыдні, але хтосьці даслаў электронны ліст, дзе вінаваціў пастыра ў прыставаньнях. Да галасаваньня дайшло, толькі калі Робінсан ачысьціўся ад грахоў.

**Унук аяталы Хамэйні Хасэйн** сказаў у інтэрвію газэце «Аш-шарк аль-аўсат», што выдаецца ў Лёндане: «Ірану патрэбны дэмакратычны ўрад, які б не ўжываў рэлігіі для рэпрэсій». Хамэйні-малодшы жыве цяпер у Іраку. Ён намякнуў, што пагадзіўся б з амэрыканскай інтэрвэнцыяй у Іран.

**Сяргей Мікулевіч**



«КОМСОМОЛЬСКАЯ ПРАВДА В БЕЛАРУСИ»

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### КАНТАКТЫ

**Бясплатна** вышлю як zip або doc сьпіс беларускіх навуковых назваў 638 птушак Эўропы (лацінa — расейская — беларуская). Harrier@tut.by

**Купалавы чытаньні** штотыдзень у нядзелю 10, 17, 24, 30 жніўня ў 17.30 ля помніка паэту

**На сайце УНА-УНСО** зьявілася беларуская старонка. Упершыню па-беларуску — Цытатнік Экзыстанта! Зазірні на www.una-unso.org

**ZBSB.org** — сайт Згуртаваньня беларусаў сьвету «Бацькаўшчына». Т.: 289-31-94

**Olsa.by.ru** — сайт беларускай сярэднявечнай музыкі

**Аматары** Беларускага футболу! Ці ня скінуцца нам — хто па колькі зможа — ды не запрасіць трэнэра-замежніка? Бо ні Лайдачны, ні Халявееў ня здольныя стварыць dream-team зь беларускай зборнай! А вось Гуус Хідынг — той змог бы! Разьюшаны заўзятар

### КНІГІ

**Куплю** Энцыкляпэдыю гісторыі Беларусі (т.3). Т.: 230-91-53

**Набуду поўны збор** твораў Уладзімера Караткевіча (9 кніг). Т.: 274-52-65. Сяргей

**Прадам** Нацыянальны атлас Беларусі. Т.: 230-91-53

### ПАКОЙ

**Здыму пакой** уздоўж лініі мэтро ў цэнтры. Своечасовасьць аплаты ды парадак гарантую. Т.: 214-42-14, 213-30-20

### ПРАДАМ

**Прадам** ровар спартовы «Старт-шаша» (б/в, неабходны дробны рамонт), за 15$. Т.: 220-25-77

**Прадам** газавую пліту б/в. Танна. Т.: 264-75-41

**Дрэўцы ружы** кітайскай танна прадам. Т.: 221-21-81. Слава

## НОВЫЯ КНІГІ

**Барадулін Р., Быкаў В. Калі рукаюцца душы...:** Паэзія з прозай. — Менск: ГА БТ «Кніга», 2003. — 344 с.: іл.

Зборнік знаёміць з гутаркай-ліставаньнем, што вялося паміж Быкавым і Барадуліным цягам апошніх гадоў. Тут зьмешчаныя прыпавесьці В.Быкава ды вершалісты Р.Барадуліна, пісаныя паэтам з Вушачы й Менску ў Фінляндыю ды Нямеччыну. Ілюструюць выданьне аўтарскія малюнкі Васіля Быкава. Пытайцеся ў «Сьветачы», «Кнігарні пісьменьніка», «Акадэмкнізе».

**Жыбуль В. Дыяфрагма:** Паэзія. — Менск: І.Логвінаў, 2003. — 112 с. 200 ас.

У зборнічак выбраных вершаў увайшлі «самыя ўзнёслыя, самыя чыстыя» творы 1995—2002 г. Цана ў «Кнігарні пісьменьніка» — каля 4000 руб.

**Маладая жанчына ў небясьпецы** / Пад рэд. Б.Леві; Перакл. з ангельск. А.Кузьміча і А.Барысавай. — Менск: Тэхналёгія, 2003. — 247 с.




Зборнік, падрыхтаваны вядомай амэрыканскай дасьледніцай, прысьвечаны адной з самых «закрытых» гендэрных праблемаў сучаснага грамадзтва — гвалту й прымусу ў дачыненьнях паміж маладзёнамі. Аўтары зьмешчаных у кнізе артыкулаў разглядаюць прычыны сэксуальнай жорсткасьці сярод падлеткаў ды прапануюць спосабы, якія дазволяць маладым жанчынам спыніць ці прадухіліць насільле. Такога кшталту дасьледаваньне па-беларуску выходзіць упершыню.

**Тацяна Вабішчэвіч**

# Візыт расейскіх журналістаў каштаваў 40—60 мільёнаў рублёў

Паводле самых сьціплых падлікаў, кошт «экскурсіі» расейскіх журналістаў, запрошаных А.Лукашэнкам, мусіў скласьці 40—60 мільёнаў рублёў. Мяркуйце самі: за пражываньне ў камфортных менскіх гатэлях грамадзяне Расеі плацяць 50—70 у.а. За два дні на 70 чалавек — 7000—10000 даляраў. Харчаваньне (два абеды, дзьве вячэры) ў рэстарацыі такому творчаму калектыву абыдзецца ў 2520 у.а. Транспартныя выдаткі (журналістаў вазілі па прадпрыемствах): арандаваць два аўтобусы на дзень каштуе 360 даляраў (748800 руб.).

Як паведаміла «Белорусская газета», квіткі ад сваіх гарадоў да Масквы прадстаўнікі расейскіх мэдыяў аплачвалі самі. Але ў гэта слаба верыцца. Бо дарога ад Екацярынбургу да Масквы і назад каштуе 310 у.а., ад Омску (самалётам) і назад — 20000 расейскіх рублёў, абo 1368200 нашых (і гэта самы танны тарыф). Ці ёсьць такія грошы ў правінцыйных расейскіх выданьняў?

Агулам для 50 рэгіяналаў (яшчэ 20 былі з маскоўскіх ды смаленскіх выданьняў) кошт квіткоў ад іх радзімаў да Масквы і назад склаў каля 5000 у.а. Гэтульнкі сама каштавала і дарога ад Масквы да Менску зь вяртаньнем (у купэйных вагонах) для ўсіх журналістаў.

Кошту прэзэнтаваных журналістам сувэніраў мы ня ведаем. Усяго за грошы, вытрачаныя на гэтую «сьціплую размову», можна было зрабіць пяць складаных апэрацый на сэрцы.

Пры канцы сустрэчы з журналістамі Лукашэнка заявіў аб сваім жаданьні ладзіць такія спатканьні рэгулярна, і з удзелам прадстаўнікоў не трыццаці, як гэтым разам, а ўсіх дзевяноста суб'ектаў Расейскае Фэдэрацыі, з Благавешчанскам уключна.

**Вераніка Дзядок**

Наша Ніва КУПОН БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБВЕСТКІ

Запоўніце гэты купон, і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш за 15 словаў) бясплатна. А/с 537, 220050, Менск.

Тэкст ____________________

____________________

Імя і прозьвішча ____________________

Адрас, тэлефон ____________________

Наступны нумар «НН» выйдзе **22 жніўня**, у пятніцу. У Менску ў продажы — з абеду чацьвярга.

**Наша Ніва**
незалежная газэта
заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

| | |
|---|---|
| сакратарка рэдакцыі | Наста Бакшанская |
| галоўны рэдактар | Андрэй Дынько |
| выпускны рэдактар | Сяргей Ёрш |
| карэктар | Сяргей Петрыкевіч |
| карэктарка | Галіна Рабянкова |
| нам. галоўнага рэдактара | Андрэй Скурко |
| тэхнічны рэдактар | Андрэй Чык |
| выдавец і заснавальнік | Фонд выданьня газэты «Наша Ніва» |

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 8 палос фарматам А2, 4 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск код 764.
Наклад 3471. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 01.00 07.08.2003.
Замова № 4050.
Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а